ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дарожным дадаткам „Прафрух“)
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—60 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбавку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-86
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

АЎТОРАК
15 красавіка 1930 г.
№ 88 (3596)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

За бальшавіцкае выпраўленьне памылак

Пастанова Бюро Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б аб становішчы ў Магілеўскай партарганізацыі мае вялікае палітычнае значэньне. У сваёй пастанове Бюро ЦК дае правільную і выразную ацэнку палітычным памылкам і правалам магілеўскага парткіраўніцтва і вызначае асноўныя задачы, які стаяць перад Магілеўскай округовай партарганізацыяй.

Што мы мелі ў Магілеве, у чым заключаюцца грубыя палітычныя памылкі кіраўніцтва Магілеўскай партарганізацыі, адзначаныя ў пастанове Бюро ЦК? Яны заключаюцца ў тым, што Магілеўскі АК ня здолеў па-бальшавіцку, рашуча і своячасова мабілізаваць партыйную арганізацыю на выпраўленьне перагібаў і скажэньняў лініі партыі, дапушчаных у акрузе ў практыцы калгаснага будаўніцтва, у тым, што округком у радзе выпадкаў несвоячасова і нерашуча змагаўся з права - апартуністычнымі і «левымі» вылазкамі супроць лініі партыі.

Магілеўскае парткіраўніцтва, адчуваючы моцнае «головокружение» ад посьпехаў, ухваліла рад непартыйных, палітычна шкодных пастаноў, якія скажалі лінію партыі, дэзарыентавалі партарганізацыю. Акругком, напрыклад, груба сказіў лінію партыі ў адносінах да беднякоў і сераднякоў, якія ня ўступілі ў калгасы, даўшы дырэктыву аб 25-процантным зьніжэньні норм зямлякарыстаньня для ўсіх сялян - некалгаснікаў. Студзеньскі пленум Магілеўскага АК дэзарыентаваў партыйную арганізацыю сваёй ультра-«левай» пастановай аб «ліквідацыі новай буржуазіі, як клясы».

Пад уражаньнем першых посьпехаў калектывізацыі ў акрузе, Магілеўскі АК «не заўважыў» як у радзе месц асобныя парткамітэты, ячэйкі і нават партарганізацыі груба скажалі лінію партыі па калгасным будаўніцтве. У некаторых раёнах сыстэматычная і ўпартая работа па калгасным будаўніцтве была падменена масавым раскулачваньнем сераднякоў, унутэр-прышыбеёўшчынай, арыштамі беднякоў і сераднякоў, якія не жадалі ўступіць у калгасы, прымусовым абагуленьнем усяе маемасьці, авантурніцкай «ліквідацыяй» месцачковых нэпманаў і гандляроў і г. д. і г. д.

Самай глыбокай, самай грубай палітычнай памылкай Магілеўскага парткіраўніцтва зьяўляецца тое, што яно несвоячасова, нерашуча і невыстарчальна рэагавала на гэтыя злачынныя скажэньні партыйнай лініі. У выпраўленьні перагібаў і скажэньняў, дапушчаных у практыцы калгаснага руху, усялякая нерашучасьць, усялякая маруднасьць, усялякая папавіннасьць недапушчальны. Яны толькі на руку кулаку, толькі дапамагаюць правым і «левым» апартуністым у іх барацьбе супроць партыі, толькі спрыяюць усялякім спробам клясавых ворагаў дыскрэдытаваць ідэю калектывізацыі і сарваць правядзеньне веснавой сяўбы. Пастанова Бюро ЦК з усёй выразнасьцю падкрэсьлівае, што «бюро Магілеўскага АК ня здолела выразна і рашуча паставіць пытаньне аб выпраўленьні памылак і ліквідацыі скажэньняў партыйнай лініі ў калгасным будаўніцтве». Магілеўскае парткіраўніцтва не зразумела, ці не жадала зразумець, што яго нерашучасьць і несвоячасовасьць у выпраўленьні дапушчаных памылак прыносяць вялікую шкоду калгаснаму будаўніцтву. Зусім ня дзіва, што ў Магілеве, як адзначае Бюро ЦК, мы мелі «марудную і несвоячасовую мабілізацыю ўсяе Магілеўскае партарганізацыі на барацьбу з элемэнтамі, якія супраціўляюцца правядзеньню лініі партыі».

У барацьбе з апартуністымі правага і «левага» толку магілеўскае парткіраўніцтва ў радзе выпадкаў праяўляла недапушчальную нерашучасьць і папавіннасьць, якія проста мяжуюцца з прымірэнцтвам. У шклоўскай і крычаўскай справах, калі трэба было бязьлітасна ўдарыць па правых і «левых» апартуністых, якія адкрыта выступілі супроць дырэктыў партыі, Магілеўскі АК заняў яўна прымірэнчую пазыцыю. Акругком партыі ня здолеў, як падкрэсьлівае Бюро ЦК, даць рашучага і своячасовага адпору праваапартуністычным элемэнтам і «левым» загібшчыкам. Гэта толькі ўзбройвала правых апартуністых і «левых» фразэраў у іх спробах атакаваць генэральную лінію партыі і паспабляла барацьбу ЎСЁЙ партыйнай арганізацыі з правым і «левым» апартунізмам за лінію партыі.

Ці варта дзівіцца, што нерашучасьць магілеўскага парткіраўніцтва ў барацьбе з апартуністычнымі элемэнтамі і яго несвоячасовасьць і маруднасьць у выпраўленьні перагібаў і скажэньняў партыйнае лініі, дапушчаных у калгасным будаўніцтве, спрылялі згортваньню калектывізацыі ў акрузе, развалу часткі калгасаў і адліву беднаты і серадняцтва з калектываў? Пакуль магілеўскае парткіраўніцтва «адпачывала» на сваіх пазыцыях прымірэнцтва, нерашучасьці маруднасьці і папавіннасьці, дзейнічаў клясавы вораг, дзейнічалі кулацтва і яго палітычныя агэнты — правыя апартуністыя. Процант калектывізаванай плошчы ў акрузе з 20 сакавіка па 1-га красавіка зьменшыўся з 76 да 20. Бясспрэчна, аднэй з самых важнейшых прычын гэтага зьніжэньня зьяўляюцца грубейшыя праваапартуністычныя скажэньні і «левыя» перагібы, дапушчаныя пры правядзеньні калектывізацыі ў акрузе, на якія магілеўскае парткіраўніцтва рэагавала нерашуча і несвоячасова.

Усе гэтыя факты ня могуць ня выклікаць пытаньня аб тым, у якім стане знаходзіцца самакрытыка ў Магілеўшчыне, як магілеўскае парткіраўніцтва выконвала лёзунг партыі аб разгортваньні дзейснай бальшавіцкай самакрытыкі. Нам зусім ясна, што іменна з прычыны слабага і нездавальняючага разгортваньня самакрытыкі ў арганізацыі мы сталі перад фактам грубых палітычных памылак і сур'ёзных прарываў, дапушчаных у Магілеве. Іменна таму, што самакрытыка ў арганізацыі не разгорнута, магілеўскае парткіраўніцтва ня здолела своячасова выправіць сваіх памылак і правалаў. Хіба-ж ня ясна, што, калі-б самакрытыка ў Магілеўскай партарганізацыі была шырока разгорнута, дык палітычныя памылкі акругкому былі-б своячасова жорстка і рашуча раскрытыкаваны і выпраўлены, дык рад цяперашніх правалаў магілеўскага парткіраўніцтва бясспрэчна быў-бы папярэджаны. Гэтага ня было і таму самакрытыка ў Магілеве ня была накіравана на своячасовае выкрыцьцё і выпраўленьне памылак, на рашучае выпраўленьне перагібаў і скрыўленьняў партыйнай лініі ў калгасным будаўніцтве. Наадварот, у радзе месц, праваапартуністычныя элемэнты і «левыя» загібшчыкі пад сьцягам самакрытыкі выступілі супроць лініі партыі, сталі выць аб тым, што «партыя адступае», што «партыя спаўзае на пазыцыі правых і адмаўляецца ад капектывізацыі», што «мы робім уступку кулаку» і г. д., і да т. п. Якраз такім спробам пад сьцягам самакрытыкі атакаваць лінію партыі, пад сьцягам самакрытыкі дыскрэдытаваць ЦК партыі, як гэта мы мелі ў Чэрыкаве, Шклове і г. д. ня было дана бязьлітаснага, своячасовага і жорсткага адпору.

Мы са здавальненьнем адзначаем, што бюро Магілеўскага АК КП(б)Б і прэзыдыум АКК у сваёй пастанове, апублікаванай 9-га красавіка ў «Камунары Магілеўшчыны», прызналі рад сваіх палітычных памылак і прарываў. Але мы лічым, што ў сваёй пастанове бюро Магілеўскага акругкому і прэзыдыум АКК прызналі далёка ня ўсе свае памылкі, што бюро АК і прэзыдыум АКК у сваёй пастанове абышлі рад сваіх памылак і ўхвалілі адзін пункт, які нельга інакш назваць, як замаскаваным пратэстам супроць самакрытыкі і жаданьнем апраўдаць хаця-б у некаторай ступені свае палітычныя правалы. Канкрэтна мы маем на ўвазе той пункт з пастановы бюро Магілеўскага АК і прэзыдыуму АКК, у якім гаворыцца, што «ўсялякія спробы асобных таварышоў ставіць пытаньне быццам-бы ў бюро АК КП(б)Б была іншая лінія, асобная ад лініі партыі, зьяўляюцца замаскаваным наскокам на лінію партыі». Якраз гэты пункт трэба ацаніць ня інакш, як укосны замаскаваны ўдар па самакрытыцы, як жаданьне зьняць з сябе частку віны за скрыўленьне партыйнае лініі. Іменна той факт, што магілеўскае парткіраўніцтва ўхваліла рад непартыйных пастаноў, што яно прымірэнча адносілася да правых і «левых» апартуністых, што яно праявіла недапушчальную нерашучасьць, несвоячасовасьць і папавіннасьць у выпраўленьні перагібаў і скажэньняў партыйнай лініі ў калгасным будаўніцтве, — сьведчыць аб тым, што лінія бюро акруговага камітэту разыходзілася з лініяй нашай партыі.

Нарэшце, мы ня можам абыйсьці моўчкі таго, што ў пастанове бюро Магілеўскага акругкому партыі літаральна нічога не гаворыць аб сваёй памылковай, палітычна шкоднай пастанове аб 25-процантным зьніжэньні норм зямлякарыстаньня. Зусім ясна, што гэта пастанова нічога агульнага з лініяй партыі ня мае, што гэта пастанова груба скрыўляе лінію партыі ў адносінах да беднякоў і сераднякоў, якія ня ўступілі ў калгасы. Тым больш дзіўна, што бюро Магілеўскага АК КП(б)Б і прэзыдыум АКК ня прызналі адкрыта гэтай грубейшай палітычнай памылкі. Аб гэтым сьведчыць тое, што ў сваёй пастанове, апублікаванай 9 красавіка, гэта пытаньне абойдзена моўчкі.

Таксама не зразумела, чаму бюро Магілеўскага АК КП(б)Б і прэзыдыум АКК ў сваёй пастанове толькі адзначылі, што «Студзенскі пленум АК дапусьціў палітычную памылку, даўшы ўстаноўку на ліквідацыю «новай буржуазіі». Мы лічым, што бюро АК і прэзыдыум АКК павінны былі выразна сказаць, чаму яны некалькі месяцаў палец аб палец ня стукнулі, каб ужыць патрэбныя меры па выпраўленьні гэтае памылкі. Мы лічым, што бюро АК і прэзыдыум АКК ў сваёй пастанове павінны былі сказаць, чаму яны да 9 красавіка нічога ня ўжылі да таго, каб пленум Магілеўскага акругкому партыі скасаваў сваю непартыйную пастанову.

Пастанова Бюро Цэнтральнага Камітэту выразна ставіць перад Магілеўскай партыйнай арганізацыяй задачы, якія павінны быць выкананы ва што-б там ні стала. Магілеўская партарганізацыя, як і ўсе партыйныя арганізацыі КП(б)Б, павінна дакладна прапрацаваць пастанову Бюро ЦК і глыбока ўсьвядоміць сутнасьць памылак і правалаў магілеўскага парткіраўніцтва. Гэта дапаможа партыйным арганізацыям яшчэ больш узмацніць сваю работу па хуткім і рашучым выпраўленьні памылак і перагібаў, дапушчаных у практыцы калгаснага руху, па далейшым замацаваньні калгаснага будаўніцтва на аснове дырэктыў партыі.

На прыкладзе магілеўскага кіраўніцтва партыйныя арганізацыі Беларусі яшчэ раз упэўніліся, што ўсялякая нерашучасьць, усялякая несвоячасовасьць у выпраўленьні памылак і скажэньняў у калгасным будаўніцтве толькі на руку кулаку, толькі дапамагаюць правым і «левым» апартуністым атакаваць генэральную лінію партыі.

Мы глыбока ўпэўнены, што бальшавіцкая Магілеўская партарганізацыя цалкам і поўнасьцю выканае задачы, ускладзеныя на яе ЦК партыі і накіруе зброю самакрытыкі на хуткую і рашучую ліквідацыю перагібаў і скажэньняў партыйнае лініі па калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

ПАРАДАК АПЛАТЫ ЗА БРАК І ПРАСТОІ НА ВЫТВОРЧАСЬЦІ

МАСКВА, 12. Наркампрацы СССР устанавіў парадак аплаты за брак і прастоі на вытворчасьці.

Брак, які робіцца па незалежных ад работніка прычынах і які ня можа быць своячасова зьнішчаны, аплачваецца нараўне з годнымі вырабамі. Калі-ж брак быў зроблены па віне работніка (з прычыны няўважлівай працы, незахоўваньня тэхнічных правіл і г. д.), дык ён аплаце не падлягае. Норма браку вызначаецца РСІ.

За псаваньне матар'ялу, якое адбылося па віне працаўніка, можа быць зроблена вылічэньне з яго заработку ў разьмерах сапраўднага кошту матар'ялу (але ня больш 1/3 месячнае тарыфнае стаўкі гэтага працаўніка). Прастоі па віне працаўніка (з прычыны незахаваньня тэхнічных правіл), сьвядомага ўхіленьня ад працы і г. д. не аплачваюцца.

таксама прымаць усе залежныя ад яго меры да папярэджаньня адміністрацыі аб прычынах, якія могуць выклікаць прастой. Калі ён гэтага ня зробіць, дык прастой не аплачваецца, а на работніка, апрача таго, можа быць накладзена спагнаньне. Адміністрацыя павінна прымаць усе меры да ўхіленьня і папярэджаньня прастояў, а ў выпадку іх няўхільнасьці — да выкарыстоўваньня свабодных рабочых на іншых работах. Адміністратары, якія ня будуць прымаць мер да правільнага выкарыстоўваньня рабочае сілы, нясуць матар'яльную адказнасьць за страты, нанесеныя іх бязьдзейнасьцю. Прастоі арганізацыйна - вытворчага характару, затрымка ў забесьпячэньні матар'ялам. інструмантамі, паломка рухавіка і г. д. аплачваюцца наступным чынам: за прастой ня звыш 3-х дзён падрад — паводле сярэдняга заработку, за прастой звыш 3-х дзён — паводле тарыф-

Даб'емся 100-процантнага выкананьня пляну сяўбы

Прысьпяшыць адвод яравога кліну індывідуальным гаспадаркам. Рашуча змагацца з перагібамі пры зямляўпарадкаваньні. Узмацніць дапамогу бядняцкім гаспадаркам цягавай сілай, насеньнем і крэдытамі.

14 калгасаў Быхаўскага раёну поўнасьцю ўзаралі яравы клін.

КСУ не арганізавалі належнай дапамогі бядняцкім гаспадаркам

Арганізацыя дапамогі бядняцкім і маламоцным серадняцкім гаспадаркам у правядзеньні веснавой сяўбы нездавальняючая. Асабліва дрэнна ідзе забесьпячэньне бядняцкіх гаспадарак цягавай сілай і інвэнтаром. Большасьць камітэтаў сялянскае ўзаемадапамогі ўсё яшчэ бязьдзейнічае.

ЦК КСУ абсалютна ня ў курсе справы таго, што робіцца на мясцох. Дрэнную працу камітэтаў узаемадапамогі характарызуюць наступныя лічбы па 60 раёнах БССР.

На 1-га красавіка загатоўлена па лініі КСУ насеньня 378.000 пудоў. Паводле пляну-ж павінна было быць загатоўлена 740.000 пудоў — план выкананы толькі на 51 проц.

Заданьне па ачыстцы насеньня выкавана на 67 проц.: замест 1.600.000 пудоў, ачышчана толькі 1.069.000 пудоў.

Абменена насеньня ўсяго... 27.530 пудоў, што зьяўляецца фактычна зрывам гэтага мерапрыемства па лініі камітэтаў узаемадапамогі.

Як разьмеркавана загатоўленае насеньне сярод бядняцкіх гаспадарак — ЦК КСУ ня ведае.

Зусім слаба ідзе збор попелу. На 1-га красавіка па лініі КСУ сабрана 201.320 пудоў попелу — 25 проц. пляну. Арганізацыі на мясцох нічога ня робіць для фарсаваньня збору попелу і поўнага выкананьня заданьня.

Нявыканана заданьне па арганізацыі працоўных дружын дапамогі бясконным гаспадаркам, удовам, інвалідам і сем'ям чырвонаармейцаў.

Такіх дружын арганізавана толькі 611—74 проц. заданьня.

Па 40 раёнах БССР няма ніякіх вестак аб працы камітэтаў узаемадапамогі.

Нарэшце, трэба адзначыць, што ў КСУ ляжаць нявыкарыстаныя 319.000 руб., вызначаных на куплю насеньня для бядняцкіх гаспадарак.

Трэба зараз-жа прыняць рашучыя меры да паляпшэньня работы КСУ па мясцох і поўнага выкананьня імі пляну дапамогі бядняцкім гаспадаркам.

С. Г.

Не хапае цягавай сілы

10 красавіка 11 буйных калгасаў Дрыбінскага раёну (Аршаншчына) арганізавана выйшлі ў поле. З вялікім уздымам калгасьнікі Дрыбіншчыны ўзяліся за перабудову сельскае гаспакаркі на калектыўных пачатках. Калгасы забясьпечаны насеньнем і с.-г. інвэнтаром у патрэбнай колькасьці.

Да адмоўных бакоў калгаснага будаўніцтва ў раёне трэба аднесьці маруднасьць у справе арганізацыі машынаконных калён, якія-б зараз маглі дапамагчы калгасам. У некаторых калгасах адчуваецца недахват цягавай сілы з тэй прычыны, што іх склад пераважна бядняцкі.

Дрыбінскі райвыканком павінен зараз-жа ўжыць усе неабходныя меры, каб дапамагчы калгасам раёну апрацаваць яравы клін.

ФОМІЧАЎ.

УВАГА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЮ БЯДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК ЦЯГАВАЙ СІЛАЙ

Неадкладна вырашыць пытаньне аб крэдытаваньні закупкі коняй

Учора Беларуская кантора Калгасбанку атрымала рад паведамленьняў аб тым, што ў радзе раёнаў крэдыты, вызначаныя на крэдытаваньне індывідуальных бядняцка - серадняцкіх гаспадарак, ужо вычэрываюцца. Крэдыты ідуць пераважна на задаваленьне патрэб бядняцкіх гаспадарак.

Побач з гэтым, выяўляецца, што невызначэньне крэдытаў на закупку коняй індывідуальным бядняцкім гаспадаркам награжае недасевам у гэтых гаспадарках, з прычыны адсутнасьці ў іх цягавай сілы. Камітэты узаемадапамогі ня могуць забясьпечыць бядняцкія гаспадаркі цягавай сілай з тае прычыны, што яны, з аднаго боку слаба падрыхтаваліся да сяўбы, а з другога — ня маюць патрэбных сродкаў.

Беларуская кантора Калгасбанку атрымала з раёнаў рад тэлеграм, у якіх месцы настойваюць на неадкладным вызначэньні крэдытаў, на закупку коняй для бядняцкіх гаспадарак. Між іншым, да гэтага часу Беларускай канторай Калгасбанку было дазволена раённым крэдытным таварыствам крэдытаваць індывідуальны сэктар на закупку толькі насеньня, інвэнтару і вапны. Крэдытаваньне-ж індывідуальнага сэктару на закупку коняй не прадугледжана.

У сувязі са становішчам, якое стварылася ў бядняцкіх гаспадарках раду раёнаў, неабходна тэрмінова вызначыць пэўную суму крэдытаў на забесьпячэньне гэтых гаспадарак цягавай сілай. Трэба абмеркаваць таксама мэтазгоднасьць скарыстаньня на закупку коняй крэдытаў па тых параграфах, якія зусім ня выкарыстоўваюцца, або скарыстоўваюцца слаба.

Ажыўленьне на рынках

Усюды ў мястэчках і гарадох адноўлены рынкі. Адчуваецца значнае ажыўленьне рыначнага звароту. Адная, у некаторых мясцох, дзе былі дапушчаны вельмі грубыя перагібы, рынкі хоць і адкрыты, але яшчэ не разгорнуты.

На рынках паявілася шмат яек, сыру, мёду. Ёсьць масла. Сьвініны і сала мала. Зьявіліся і замаскаваныя вырабы з дзерава. На рынках шмат калгасьнікаў.

На здымку: калгасьніцы ў вольны ад работы час чытаюць газэту

Патроіць прадукцыйнасьць трактараў

400 трактараў—на 2-х і 3-зьменную работу

У некаторых раёнах БССР калгасы адчуваюць значную нястачу цягавай сілы. Аб гэтым паведамляюць з Мазырскай, Менскай і іншых округ. Рад калгасаў заяўляе, што калі ім не дапамогуць цягавай сілай, дык сяўба ў іх зацягнецца да канца ліпеня.

У сьвятле гэтых фактаў проста злачынным зьяўляецца вельмі нерацыянальнае выкарыстоўваньне трактараў саўгасамі і калгасамі.

У БССР зараз налічваецца каля 400 трактараў. Дырэктыва аб пераводзе іх на двухзьменную працу ніадзе ня выконваецца. Саўгасы і калгасы, якія маюць трактары, такім чынам, не скарыстоўваюць іх рацыянальна самі і пакуль што не зьбіраюцца дапамагаць тым калгасам, якія адчуваюць вострую нястачу ў цягавай сіле.

У сувязі з гэтым, неабходна заразжа прыняць рашучыя меры да пераводу ўсіх трактараў ня толькі на двухзьменную, але нават і на трохзьменную работу.

Для арганізацыі начное працы трактараў няма ніякіх непераможных перашкод. Што датычыцца трактарыстых, дык да гэтага часу цалкам нават не скарыстаны наяўны кадр. Па сёньнішні дзень, напрыклад, у БССР мы маем звыш 750 трактарыстых, з якіх працуе толькі каля 400.

Няма ніякіх сумненьняў у тым, што пры 2-хзьменнай, а ў некаторых мясцох 3-хзьменнай працы трактараў, будзе поўная магчымасьць дапамагчы тым калгасам, якія адчуваюць нястачу ў цягавай сіле.

На жаль, да гэтага часу ніякіх рашучых крокаў у гэтым напрамку ніякім не прымаецца.

Вінаватыя прыцягваюцца да адказнасьці

Генэральная праверка выкрыла рад прарываў на пасеўным фронце. У зьвязку з гэтым ЦКК РСІ ўжыты рад мер.

Магілеўскай акруговай КК РСІ даручана зараз-жа высьветліць прычыны закрыцьця рынкаў і прыцягнуць вінаватых да адказнасьці.

Гомельскай АКК РСІ даручана заразжа расьсьледаваць прычыны нядбайных адносін да вырабу запасных частак да трактароў на заводзе імя Ланцуцкага. Белсельснабу даручана забясьпечыць завод матар'ялам.

За нядбайныя адносіны Белсельснабу да забесьпячэньня раёнаў насеньнем гародніны, якое праляжала на складах бяз руху каля двух тыдняў, абвешчана суровая вымова члену праўленьня т. Будніку.

Калгасы выконваюць пасеўны план

МАГІЛЁЎ. (Па тэлефону). У радзе калгасаў Магілёўскай округі палявыя работы і сяўба праходзяць вельмі арганізавана і з вялікім уздымам. 14 калгасаў Быхаўскага раёну ўзаралі ўсе 100 проц. вызначанага яравога кліну і прыступілі да сяўбы. Калгас «Заветы Ільліча» і камуна «Пралетарская Рэспубліка» ўжо канчаюць сяўбу. Большасьць калгасаў Кармянскага раёну поўнасьцю зааралі свой яравы клін і ўжо засеялі звыш 200 гэкт.

У выніку наладжанай працы калгасаў і растлумачэньня артыкулаў т. Сталіна і апошніх пастаноў ЦК узмацніўся прыпіў у калгасы. У Касьцюковіцкім раёне арганізавалася 6 новых калгасаў, якія яднаюць 137 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, у Шклоўскім раёне—4 новыя калгасы, у якія ўвайшлі 150 гаспадарак, у Быхаўскім раёне—1 новы калгас з 40 гаспадарак.

З прычыны неадводу да гэтага часу яравога кліну індывідуальным гаспадаркам у Шклоўскім раёне стварылася пагроза зрыву сяўбы—індывідуальным сэктарам. Неабходна тэрмінова прыняць рашучыя меры.

На вялікдзень зааралі 100 гэкт.

БАБРУЙСК. (Па тэлефону). Яўрэйскі калгас м-ка Шчадрын, Парыцкага раёну, які яднае 270 двароў, у першы дзень яўрэйскага вялікадня ў поўным складзе выйшаў на працу. За адзін дзень калгасьнікамі было ўзарана каля 100 гэкт.

На здымку ўрачысты мітынг калгасьнікаў «Камунар Магілеўшчыны» у час пробнага выхаду ў поле

У Калінкавіцкім раёне сяўба ў разгары

КАЛІНКАВІЧЫ (ПА ТЭЛЕГРАФУ). СЯЎБА Ў КАЛГАСАХ, САЎГАСАХ І Ў ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ГАСПАДАРКАХ УЖО РАЗГАРНУЛАСЯ. БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІЯ ГАСПАДАРКІ, ЯКІЯ НЕ ЎВАЙШЛІ Ў КАЛГАСЫ, АПОШНІМІ ДНЯМІ ВЫЯЎЛЯЮЦЬ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЬЦЬ ПЫТАНЬНЕМ КРЭДЫТАВАНЬНЯ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ВЕСНАВОЙ КАМПАНІІ Ў ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ СЭКТАРЫ. ПАСТУПІЛІ ЗАПАТРАВАВАНЬНІ АБ ВОДПУСКУ КРЭДЫТАЎ НА НАБЫЦЬЦЁ ПРЫЛАД І НАСЕНЬНЯ.

Калгасы дапамогуць індывідуальным

ГОМЕЛЬ. (Ваш кар.). КАЛГАСЫ КАМАРЫНСКАГА РАЁНУ (ГОМЕЛЬШЧЫНА) ПАСТАНАВІЛІ ПАСЬЛЯ СКАНЧЭНЬНЯ СЯЎБЫ НА КАЛГАСНЫХ ПАЛЯХ ПЕРАКІНУЦЬ СВАЮ ЦЯГАВУЮ РАБОЧУЮ СІЛУ НА ЎЗОРВАНЬНЕ ЗЯМЛІ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ БЯДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК. КАЛГАСАМІ ЎЖО ЗАСЕЯНА 200 ГЭКТАРАЎ.

ДОБРА ПРАЙШОЎ ПРОБНЫ ВЫХАД У ПОЛЕ КАЛГАСУ «ДНЯПРОЎСКІ АРАТЫ». ЯЎЧЫНСКІ КАЛГАС «ІТЭРНАЦЫЯНАЛ» ВЫСЛАЎ НА ДАПАМОГУ «ДНЯПРОЎСКАМУ АРАТАМУ» 20 ПЛУГОЎ З ПЯЦЬЮ ЦЯГАВАЙ СІЛАЙ.

Праграма веснавой сяўбы павінна быць выканана

Перад веснавой сяўбой стаіць буйнейшая задача—дабіцца максымальнага пашырэньня засеўных плошчаў і ўздыму ўраджайнасьці. Дырэктывы партыі і ўраду вызначалі пашырэньне засеваў на 11 проц. У далейшым пастановаю Саюзнага Наркамзему гэты процант павялічаны да 13. Пашырыць засеўную плошчу і поўнасьцю выканаць плян веснавой сяўбы—такое катэгарычнае, баявое заданьне партыі.

Ня ўжыць усіх мер, якія забясьпечваюць выкананьне заданьня па пашырэньні засеўных плошчаў і ўздыме ўраджайнасьці, значыць паставіць пад пагрозу посьпех усёй веснавой засеўнай кампаніі. Так стаіць пытаньне і так яго павінна сабе паставіць кожная партыйная, савецкая, калгасная, каапэрацыйная арганізацыя, кожны камуністы, кожны рабочы. Бальшавікі трымаюць, у сапраўдным сэнсе гэтага слова, экзамэн на сваё ўменьне правесьці вялізарнейшую па сваім значэньні бальшавіцкую засеўную кампанію. Труднасьці правядзеньня кампаніі, складаная палітычная абстаноўка ў радзе раёнаў, выкліканая масавымі перагібамі і скажэньнямі лініі партыі, зробленыя памылкі ў правядзеньні калектывізацыі зусім не зьяўляюцца прычынай для апраўданьня ў недавыкананьні засеўных плянаў. Задача арганізаваць сяўбу стаіць і ў адносінах да індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, якія адыгрываюць вялікую ролю наогул (ня менш паловы ўсяго ліку гаспадарак застаюцца індывідуальнымі), а ў радзе раёнаў і вобласьцей маюць пераважнае значэньне.

А між тым, шматлікія паведамленьні з месц малююць зусім кепскую карціну ў сэнсе арганізацыі сяўбы ў індывідуальным сэктары. Такія паведамленьні паступаюць з Паўночнага Каўказу, ЦЧО, раду округ Украіны, якія не дабіліся яшчэ поўнага выпраўленьня дапушчаных перагібаў, не арганізавалі яшчэ на справе дапамогі індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам. Індывідуальнікі часта аж да самага выезду ў поле не атрымлівалі паказаньня, дзе ім сеяць. Работа па вызначэньні ім зямель ідзе недапушчальна марудна. Нярэдкі выпадкі адводу яўна нявыгодных вучасткаў, памяншэньне іх разьмеру і г. д. Засеўныя пляны да індывідуальнае гаспадаркі ва многіх мясцох да гэтага часу яшчэ не даведзены. Растлумачальная кампанія аб ільготах па с.-г. падатку, за пашырэньне засеўных плошчаў у індывідуальных гаспадарках праходзіць надзвычай вяла.

Далей, недапушчальна марудна праходзіць работа па правядзеньні простых мерапрыемстваў па ўзьняцьці ўраджайнасьці (абмен гатункова насеньня на радавое, пратручваньне, збожжаачыстка). Зусім недапушчальная нядбайнасьць наглядаецца ў адносінах да малазаможных індывідуальнікаў у сэнсе падтрыманьня іх пры правядзеньні сяўбы. У радзе месц усвоілі сабе падвойна-шкоднае ўяўленьне аб тым, што бедняку, які не ўвайшоў яшчэ ў калгас, ня трэба аказваць ніякае дапамогі (у сэнсе насеньня, апрацоўкі і засеву ворнай зямлі і інш.).

У выніку ганьбаваньня работы па арганізацыі сяўбы ў індывідуальным сэктары сяўба ў індывідуальнікаў праходзіць марудна. У раёнах, у якіх да сяўбы застаюцца лічаныя дні, справа з арганізацыяй засеўнай кампаніі стаіць, з прычыны гэтага, нездавальняюча. Мясцовыя арганізацыі павінны неадкладна праверыць давядзеньне пляну сяўбы ва двара ў адносінах да індывідуальных гаспадарак. Мясцовыя арганізацыі павінны дабіцца, каб кожны бядняк, кожны серадняк, які сее індывідуальна, бязумоўна ведаў-бы аб ільготах, якія даюцца за пашырэньне, засеўных плошчаў. Павінна быць шырока вытлумачана, што падатак спагняецца па летаішнай плошчы засеву, прычым гэта адносіцца поўнасьцю да тых гаспадарак, якія бяз грунтоўных прычын скароцяць плошчу засеву ў гэтым годзе або адмовяцца яе засяваць. У апошніх выпадках нескарыстаная пад засеў зямля індывідуальнікаў павінна быць засеяна калгасамі ў сваю карысьць.

Мясцовыя арганізацыі павінны шырока растлумачыць бядняцка-серадняцкім масам выключнае значэньне для ўсяе справы сацыялістычнага будаўніцтва поўнага выкананьня ўрадовага пляну пашырэньня засеўных плошчаў.

Малазаможным сялянскім гаспадаркам з наяўных рэсурсаў страхавых насенных фондаў (сабраных у індывідуальнікаў) павінны давацца пазыкі пры ўмове выкананьня засеўнага пляну. Калгасы пасьля засеву сваіх палеткаў павінны арганізаваць падтрыманьне малазаможным індывідуальным гаспадаркам, якія ня маюць магчымасьці выканаць свой засеўны плян.

Шпаркае і рашучае выпраўленьне антысерадняцкіх перагібаў зьяўляецца неабходнай умовай пасьпяховага правядзеньня засеўнай кампаніі. Найменшае замаруджаньне ў гэтай справе будзе азначаць удар, перш за ўсё, па засеўнай кампаніі, простую дапамогу кулаку, які прыкладае ўсе намаганьні, каб сарваць нашу бальшавіцкую сяўбу.

(«Правда»).

ДУТЫЯ ЛІЧБЫ АБ КАНТРАКТАЦЫІ

У цэнтральных маскоўскіх газэтах мы маглі прачытаць паведамленьне (пабудаванае на матар'ялах Наркамгандлю СССР) аб тым, што Беларусь плян кантрактацыі засеваў ўжо выканала поўнасьцю і нават значна перавыканала.

Мы павінны катэгарычна заявіць, што гэта няправільна, і здарылася гэта таму, што Наркамгандаль БССР пасылаў у Маскву яўна памылковыя весткі.

З гэтага поваду нам далі такую справаку. Плян Наркамгандлю СССР прадугледжваў, як гэта звычайна бывае, кантрактацыю яравых засеваў, а Наркамгандаль БССР, пасылаючы ў Маскву зводку аб калтрактацыі збожжавых засеваў, уключыў сюды і азімы клін, прычым гэтага не абгаварыў. І вось Наркамгандаль СССР на базе гэтых няправільных вестак, вывеў выкананьне кантрактацыі збожжавых засеваў па Беларусі ў 133 проц. Мы ня ведаем, як трэба кваліфікаваць такія дзеяньні з боку Наркамгандлю БССР--няхай гэтым зойміцца РСІ.

Зводка Белпаляводсаюзу на 1-га красавіка паказвае зусім іншыя лічбы выкананьня пляну кантрактацыі: па збожжавых культурах—56 проц., па ільнавалакне—89 проц., па ільну-семі—85 проц., па каноплях—70 проц. па канюшыне—52 проц., па віцы—54 проц., лубіне—30 проц., сэрадэлі—86 проц. і толькі па бульбе паказваецца перавыкананьне пляну—116 проц.

Але і гэтыя лічбы, паданыя ў афіцыйнай зводцы, зусім нерэальныя і вельмі далёкі ад таго сапраўднага стану, які мы маем на мясцох.

Работнікі на мясцох, як выяўляецца, ніякай увагі не заслугоўваюць на работу па кантрактацыі сярод індывідуальных гаспадарак—яны, бядняцка-серадняцкія гаспадарак, робячы вялікую памылку, працуюць і гаспадарчую памылку, працуюць і гаспадарак. А гэта дрэнна бок кантрактацыі ў калгасах аказаўся назьнічаным. Дагавары ў большасьці выпадкаў заключаліся на агульных сходах калгасьнікаў, а часамі нават і на асобных працуюць леньняў калгасу. Такога дагавары даваліся па подпісу, які часта нават і не чытаўся. Такія адносіны да кантрактацыі павінны як простым злачынствам пасьпець пельга Праўленьня Белпаляводсаюзу, добра ведаючы аб такой работе на кантрактацыі

Палонныя кітайскія камуністы расстрэльваюцца з кулямётаў

Кітайская прэса апраўдвае нячуванае ўмяшанне французкага імпэрыялізму ва ўнутраныя справы Кітаю

ШАНХАЙ, 13. Кітайская прэса, у прыватнасці кітайскія тэлеграфныя агенцтвы, прабуе апраўдаць нячуваную ўмяшальнасьць французкіх улад Індакітаю ва ўнутраныя справы Кітаю. Агенцтвы заяўляюць, што, быццам, дамагома французаў была нібы выпадковай, не праднамеранай. Трэба адзначыць, што ні ўрад, ні прэса не пратэстуюць супроць заглушэньня французкімі уладамі сялянскага руху на тэрыторыі Кітая. Мала таго, агенцтва Гавас выказвае жаль з прычыны таго, што тры французкія аэраплены, падчас палётаў, былі вымушаны зьнізіцца на тэрыторыі, занятай паўстанцамі. Уратуй ў палон кітайскія камуністы расстрэльваліся з кулямётаў. Часьці кітайскай Чырвонай арміі адступілі ў гарыстыя раёны.

Уплыў камуністых у Шанхаі пашыраецца

Буржуазны друк б'е трывогу

ШАНХАЙ, 13. «Норд-чайна Дэйлі-Ньюс» у артыкуле, прысьвечаным трэцяй гадавіне перавароту, зробленага Чан Кай-шы, б'е трывогу з прычыны росту камуністычнага ўплыву ў Шанхаі. «Ньюс» — піша газэта — сілы камуністычнага руху, накіраванага зараз ня толькі супроць чужаземцаў, але і супроць Нанкіна. Зараз прапаганда камуністых лепш арганізавана, чым калі-небудзь раней. Камуністы ўдалося заваяваць сімпатыі значнай часткі студэнтаў. Многія студэнты працуюць у антымілітарыстычнай Лізе, Мопр'ы. У многіх школах ёсьць ячэйкі, якія вывучаюць пытаньні, зьвязаныя з камуністычным рухам. Сярод рабочых вядуць работу звыш 100 агітатараў. У мінулым годзе адбылося 40 дэманстрацый, пашырана вялікая колькасьць праклямацый на 500 тым. Паліцыя зарыла 51 ячэйку, арыштавала 294 камуністых, усе-ж, у апошні квартал камуністы праўдзівей, небачаную актыўнасьць да ўвесь час побыту Чан Кай-шы пры ўладзе. У апошнім квартале камуністы ўжо зрабілі столькі, колькі было зроблена за ўвесь мінулы год».

Газэта зазначае, што дзейнасьць камуністых узмацніпося таксама ва ўсіх сельскіх мясцовасьцях Поўдня, а таксама ў гарадох: Нанчане, Ханькоу, Чаньша, Кантоне, Амое, Ганконгу, Фуньзяне.

КЛЯСА СУПРОЦЬ КЛЯСЫ

БАРАЦЬБА ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ АНГЛІІ

ЛІЧБА БАСТУЮЧЫХ ДАСЯГАЕ 150 ТЫСЯЧ

БРЭДФОРД, 13. Забастоўка рабочых ваўнянай прамысловасьці працягваецца. Гаспадаром становішча зьяўляецца камітэт дзеяньня, пад кіраўніцтвам якога тэкстыльшчыкі ўпарта супраціўляюцца прадпрыемцам. Лік бастуючых дасягае 150 тысяч. Рэфармісцкія прафсаюзныя бюракраты не зьяўляюцца на прадпрыемствах, бо рабочыя адносяцца да іх варожа.

БРЭДФОРД, 13. Брэдфордзкі камітэт дзеяньня першапачаткова складаўся з 10 чалавек, зараз налічвае 40, пераважнае большасьць якіх зьяўляецца делегатамі, выбранымі на прадпрыемствах. Лічба камуністых у камітэце складае толькі 25 проц. агульнага ліку ўдзельнікаў, тым ня менш, рэшта членаў камітэту з поўнай гатоўнасьцю падпарадкоўцца кіраўніцтву кампартыі.

25 ТЫСЯЧ РАБОЧЫХ БАСТУЕ ВА ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 13. Паводле прыблізных падлікаў у Францыі ў сучасны момант бастуюць звыш 25 тысяч рабочых. Лік бастуючых будаўнікоў у Парыскай акрузе дасягнуў 10 тысяч. У Лільскай акрузе бастуюць мэталісты, трамвайшчыкі і больш 1.000 рабочых трэсту «Кюльман», які вырабляе ваенна-хэмічныя матар'ялы.

***

ПАРЫЖ, 13. Да бастуючых парыскіх будаўнікоў далучыліся новыя групы рабочых. Забастоўшчыкі на пакінутых набудовах вывесілі чырвоныя сьцягі. На арганізаваных бастуючымі мітынгах прымала ўдзел 10.000 рабочых. У забастовачны фонд паступаюць адлічэньні рабочых розных прафэсій.

ЗАБАСТОЎКА ДРЭЗВААПРАЦОЎШЧЫКАЎ У БАДЭНЕ

БЭРЛІН, 11. Забастоўка дрэзваапрацоўшчыкаў у Бадэне (Швайцарыя) працягваецца сёмы тыдзень. Да забастоўкі далучыліся каменшчыкі і нядаўна прыбыўшыя з Бадэну беспрацоўныя будаўнікі, якія знайшлі работу ў Бадэне. (ТАСС).

1.500 ГАРНЯКОЎ У БАЎГАРЫ ВЫКІНУТА НА ВУЛІЦУ

ВЕНА, 13. Праўленьне вугальных капальняў у г. Перніку (Баўгарыя) звольніла 1.500 горнарабочых у сувязі з рацыяналізацыяй вытворчасьці, якая праводзіцца пры ўдзеле замежнага капіталу.

ЗА ЗЬМЯШЧЭНЬНЕ АНТЫМІЛІТАРЫСЦКАГА АРТЫКУЛУ—15 МЕСЯЦАЎ ТУРМЫ

ПАРЫЖ, 10. Рэдактар «Юманітэ» тав. Сэнт-Прэ за зьмяшчэньне антымілітарысцкага артыкулу прытвораны да 15 месяцаў турэмнага зьняволеньня. За гэты-жа артыкул аўтар яго і выдаўца газэты асуджаны на такі-ж тэрмін. (ТАСС).

КАТАРЖНЫ ПРЫСУД НАД САЛДАТАМІ Ў ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 10. Салдат тав. Цір'е з 171 пяхотнага палка гарнізону Ландаў у Лётарынгіі прыгавораны ваенным трыбуналам да 18 месяцаў турэмнага зьняволеньня за антымілітарысцкую прапаганду. «Юманітэ» зазначае, што тав. Цір'е ў сапраўднасьці быў асуджаны за тое, што да ўступленьня ў армію зьяўляўся актыўным членам камсамолу. (ТАСС).

БАІ ПАМІЖ ІНВАЛІДАМІ І ВОЙСКАМІ У БУХАРЭСЬЦЕ

ВЕНА, 13. 11 красавіка, у сувязі са зьездам інвалідаў, на вуліцах Бухарэста адбываліся дэманстрацыі румынскіх інвалідаў вайны. Некалькі тысяч інвалідаў прарвалі паліцэйскі кардон, прабраліся ў цэнтр гораду і спынілі вулічны рух. У выніку сутычак з паліцыяй на вуліцах адбываліся жудасныя сцэны нэрвовых прыпадкаў у інвалідаў. Дэманстранты заходзілі паліцыю каменьнямі, параніўшы некалькі салдат і афіцэраў. Войска зьбівала інвалідаў прыкладамі. Вулічныя баі працягваліся з раніцы да позьняга вечара. Больш 30 інвалідаў паранена, з іх 4 цяжка.

На пасяджэньні парляманту підэр апазыцыі Лупу рэзка нападаў на ўрад. Міністар фінансаў Маджыару зелвіў, што ўрад гатоў дапамагчы інвалідам і абвінавачваў лібэралаў - прыхільнікаў Авэрэску ў тым, што яны справакавалі дэманстрацыю, разлічваючы такім чынам яшчэ больш завастрыць затрудненьні ўраду.

РУКАПАШНЫ БОЙ ПАМІЖ РАБОЧЫМІ І ФАШЫСЦКАЙ МІЛІЦЫЯЙ

ПАРЫЖ, 11. Італьянская газэта «Лібэртэ», якая выдаецца ў Парыжы, паведамляе аб сур'ёзных хваляваньнях рабочых у Ячэнцы (Італія), дзе ўласьнікі гуёкавых фабрык, звольніўшы ўсіх рабочых і выдаўшы грашовую выхадную дапамогу, запрапанавалі аднавіць працу пры зьніжэньні на 15 проц. заработнай платы. Абураныя гэтымі вьлезкамі рабочыя і работніцы арганізавалі дэманстрацыю пратесту і зьбілі прадстаўніка прадпрыемцаў, які зьявіўся да іх на перагаворы. Рабочыя ўступілі в выкліканай фашысцкай міліцыяй у рукапашны бой. У часе сутычак з фашыстымі некалькі рабочых паранена. Міліцыя арыштавала 20 рабочых і работніц. У адказ на гэты арышт аднавіліся рабочыя дэманстрацыі. У выніку, прэфект прымушаны быў вызваліць арыштаваных.

36-ы камуністычны рэдактар за кратамі

БЭРЛІН, 12. Рэдактар «Ротэ Фане»—Шлянг прысуджаны дзяржаўным судом у Лейпцыгу да 2-х год крэпасьці за рад артыкулаў і выкрыцьцяў закрытага пасяджэньня суду на працэсе падробшчыкаў фальшывых чырвонцаў. Шлянг зьяўляецца 36-м камуністычным рэдактарам, асуджаным у апошнія месяцы да турэмнага зьняволеньня. (ТАСС).

Польскі фашызм ліхаманкава разьвівае ваенную авіяцыю

ВАРШАВА, 13. У сучасны момант польскі ваенны флёт паводле афіцыйных даных мае 36 эскадрыльяў, якія складаюцца з 360 баявых самалётаў, апрача гідраавіяцыі, якая знаходзіцца ў стадыі будаўніцтва.

Паводле даных нямецкага друку, фашысцкая Польшча мае акрамя таго 5 гідра-эскадрыльяў. У працягу апошніх 5-6 гадоў атрымана з-за граніцы (пераважна з Францыі) каля 1.000 розных баявых самалётаў, якія знаходзяцца ў запасе. Разам з запасным Польшча мае 1.500 самалётаў, памяж імі 60-70 бамбавозаў.

Польскія самалёты пераважна новай канструкцыі. Старыя машыны замяняюцца новымі. Прыстасоўваецца сыстэма францускіх фірм. Прымаюцца ўсе намаганьні, каб вызваліцца ў гэтым напрамку ад залежнасьці заграніцы. Фашысцкі друк упарта дамагаецца стварэньня спэцыяльнага міністэрства паветранага флёту, якое павінна кіраваць ваенным і грамадзянскім флётам.

Ваенныя заказы Румыніі ў Чэха-Славакіі

ПРАГА, 7. Заводы Шкода атрымалі гэтымі днямі ад Румыніі вялікі заказ на вінтоўкі і гранаты.

Узбраеньне Чэха-Славакіі

ПРАГА, 7. Спэцыяльна створаная парляманцкая падкамісія па справах авіяцыі і газавай абароны прыступіла да працы. На першае пасяджэньне падкамісіі кампэнтаты ня былі дапушчаны. (ТАСС).

Справа Мухамэд Валі-хана

ТЭРМЭЗ, 13. Паводле атрыманых тут вестак, 6-га красавіка ў Кабуле, пад старшынством падшаха Надыр-хана, адбыўся дурбар (надзвычайны сход прадстаўнікоў пляменьняў, станаў, міністэрстваў і асобна запрошаных асоб). На дурбары разглядзена справа Мухамэд Валі-хана, прыгаворанага 11 лютага асобым судом да пакараньня сьмерцю па абвінавачаньні ў зносінах з Батэ-Сакло і здрадзе Амануле-хану. Лічачы здраду не даведзенай, дурбар выказаўся за замену сьмяротнага прыгавору тэрэмным зьняволеньнем на восем год. Чатырохтысячны натоўп на вуліцы шумна вітаў зьмякчэньне прыгавору. Перадаюць, што прагрэсыўныя колы Кабулу зьдзіўлены суровасьцю прыгавору пры поўнай недаведзенасьці абвінавачаньня.

Мухамэд Валі-хан першы надзвычайны аўгансікі пасол, дэлегаваны ў 1919 годзе ў Эўропу паведаміць аб абвешчэньні незалежнасьці Аўганістану. Апошнія гады праўленьня Амануллы Мухамэд Валі-хан займаў пасаду міністра замежных спраў, на час ад'езду Амануллы ў Эўропу займаў пост намесьніка падшаха.

У сваёй прамове на судзе 8 лютага ён катэгарычна адхіліў прад'яўленыя яму абвінавачаньні, як паклёпніцкія і выдуманыя. Амануллы-хан тады-ж паслаў з Рыма тэлеграму падшаху Надыр-хану, у якой выказваўся за абарону Мухамэда Валі-хана.

ПРЫВІТАНЬНЕ АД ШАНХАЙСКАГА КАМІТЭТУ КАМСАМОЛУ

ШАНХАЙ, 14. Шанхайскі камітэт камсамолу прыслаў камсамольцам і рабочай моладзі Ленінграду шчырае брацкае прывітаньне ў сувязі з Першамайскімі сьвятамі.

Партыйнае будаўніцтва

РАЗГОРТВАЮЧЫ БАЛЬШАВІЦКУЮ САМАКРЫТЫКУ, БЯЗЛІТАСНА ВЫКРЫВАЮЧЫ ПРАВЫХ І „ЛЕВЫХ" АПАРТУНІСТЫХ, МАГІЛЕЎСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ПАВІННА ХУТКА І РАШУЧА ЛІКВІДАВАЦЬ ДАПУШЧАНЫЯ ПЕРАГІБЫ І СКРЫЎЛЕНЬНІ.

Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б

(АД 10-га КРАСАВІКА 1930 году)

Заслухаўшы паведамленьне тав. РЫЖОВА аб становішчы ў МАГІЛЕЎСКАЙ партыйнай арганізацыі, Бюро ЦК КП(б)Б канстатуе, што Магілеўскі акругком у кіраўніцтве работай па калектывізацыі дапусьціў рад палітычных памылак, выкес рад няправільных пастаноў па пытаньні аб калектывізацыі, якія разыходзяцца з лініяй партыі.

Ня гледзячы на ясную, выразную ўстаноўку партыі па пытаньні аб ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнае калектывізацыі, студзеньскі пленум Магілеўскага акругкому ўхваліў пастанову аб ліквідацыі кулацтва і НОВАЙ БУРЖУАЗІІ, як клясы, сказіўшы, такім чынам, асноўны лёзунг партыі і паказаўшы гэтай пастановай неразуменьне таго, што «трэба бачыць розьніцу паміж нэпманамі, якія даўно ўжо пазбаўлены ў асноўным ВЫТВОРЧАЙ базы і ня маюць таму копьні-небудзь сур'ёзнай вагі ў нашым гаспадарчым жыцьці, і паміж купкамі, якія да апошняга часу мелі вялізарную гаспадарчую вагу на вёсцы і якіх мы ТОЛЬКІ ЗАРАЗ пазбаўляем іх ВЫТВОРЧАЙ базы («Запытаньні сьвяроплоўцаў і адказы т. Сталіна»).

Наперакор выразнай устаноўцы партыі аб прадастаўленьні бедняком і сярэдняком, якія не ўвайшлі ў калгасы, зямлі па фактычным землякарыстаньні, Магілеўскі акругком даў няправільную ўстаноўку аб зьніжэньні нормы фактычнага землякарыстаньня на 25 проц.

У той час, як у практыцы работы па калгасным будаўніцтве былі дапушчаны на мясцох грубейшыя памылкі, перагібы і скажэньні партыйнай лініі, акругком своячасова не рэагаваў на гэта, паказаўшы нерашучасьць і ня здолеў хутка мабілізаваць партыйную арганізацыю на рашучую барацьбу са скажэньнямі партыйнай лініі, на выпраўленьне памылак.

Антыбальшавіцкія, праваапартуністычныя пастановы Шклоўскага райкому партыі, няправільныя пастановы партсходаў Чэрыкаўскага і Крычаўскага раёнаў, невыстарчальна рашуча і своячасовы адпор праваапартуністычным элемэнтам і «левым» загібшчыкам, марудносьць і несваячасовая мабілізацыя ўсёй Магілеўскай партарганізацыі на барацьбу з элемэнтамі, якія супраціўляюцца правядзеньню лініі партыі, сьведчаць аб тым, што бюро акругкому ня здолела выразна і рашуча паставіць пытаньне аб выпраўленьні памылак і ліквідацыі скажэньняў партыйнай лініі ў калгасным будаўніцтве. У выніку гэтага, а таксама пры наяўнасьці агульнай слабасьці масавай палітычнай работы сярод батрацтва і беднаты, у Магілеўскай акрузе меў месца вялікі адліў з калгасаў (з 20-га сакавіка па 1-га красавіка процант калектывізаванай засэўнай плошчы зьнізіўся з 76,5 проц. да 20,1 проц., а процант калектывізаваных двароў—з 70,6 проц. да 19,2 проц.).

Выходзячы з гэтага, у дадатак да тых арганізацыйных мерапрыемстваў, якія праведзены ўжо Бюро ЦК (адкліканьне т. Нэйланда, роспуск Шклоўскага райкому) і прынятых ужо пастаноў акругкому (зьняцьце члена бюро АК т. Данілава, роспуск бюро Чэрыкаўскага РК і зьняцьце сакратара РК т. Бурдзілава), Бюро ЦК лічыць патрэбным тэрмінова правесьці і ставіць перад Магілеўскай партарганізацыяй наступныя задачы:

1. Зараз-жа правесьці рад мерапрыемстваў па ўзмацненьні партыйнага кіраўніцтва Магілеўскай партарганізацыі. Даручыць арганструктарскаму аддзелу ЦК у 3-хдзенны тэрмін накіраваць для пастаяннай работы ў Магілеўскую акругу групу кіраўнічых партработнікаў.

2. Кіруючыся пастановамі сакавіцкага пленуму ЦК КП(б)Б, паставіць перад акругкомамі і ўсёй партарганізацыяй, як адну з самых баявых і важнейшых задач, мабілізацыю ўсяе партыйнае арганізацыі на рашучае выпраўленьне памылак і ліквідацыю скажэньняў партыйнай лініі ў калгасным будаўніцтве. Трэба даць бязьлітасны адпор усім тым элемэнтам, якія ішчэ да гэтага часу ўпарта аказваюць актыўнае і пасыўнае супраціўленьне правядзеньню лініі партыі, рашуча выкрываць правых апартуністых і «левых» загібшчыкаў, даючы рашучы адпор усялякім апартуністычным тэорыям аб «адступленьні». Разгарнуўшы ва ўсёй партарганізацыі глыбокую прапрацоўку артыкулаў т. Сталіна і дырэктыў партыі, акругкому праводзіць курс на рашучую зьмену ўсіх тых камуністых, якія ня здольны і не праяўляюць бальшавіцкай мужнасьці ў справе выпраўленьня памылак і скажэньняў і праводзіць правільную лінію партыі.

3. Цэнтр увагі згуртаваць на разгортваньні масавай работы сярод батрацка-бядняцкіх мас, энэргічна ўзяцца за арганізацыю батрацка-бядняцкіх груп у калгасах, правесьці самае шырокае растлумачэньне пастановы ЦК УсеКП(б), артыкулу т. Сталіна «Адказы таварышом калгасьнікам» і пастаноў сакавіцкага пленуму ЦК КП(б)Б як сярод калгасьнікаў, так і сярод усёй бядняцка-сярэдняцкай масы вёскі.

4. Канцэнтруючы ўсе сілы ўвагу партарганізацыі на пасьпяховым правядзеньні веснавой сяўбы, акругкому, райкомам і ўсёй партарганізацыі самым энэргічным чынам праводзіць у жыцьцё дырэктывы ЦК, накіраваныя ў бок арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў: узмацненьне кіраўнічых калгасных кадраў, правільны догляд і ўтрыманьне абагуленай жывёлы, арганізацыя працы, арганізацыя адыходных промыслаў калгасьнікаў, уздым працоўнай дысцыпліны і г. д., рашуча дабіваючыся таго, каб шляхам правільнага вядзеньня калгаснай гаспадаркі і ўнутранага ўзмацненьня калгасаў, апошнія зьяўляліся сапраўдным прыкладам для наўкольнага бядняцка-сярэдняцкага сялянства, зьяўляліся стымулам да далейшага ўзмацненьня калгаснага руху.

5. Акругкому, райкомам і ўсёй партарганізацыі самую сур'ёзную ўвагу зьвярнуць на пытаньне праведзеньня веснавой сяўбы індывідуальнымі бядняцка-сярэдняцкімі гаспадаркамі. Бюро ЦК прапануе зараз-жа праверыць давядзеньне заданьняў па сяўбе да асобнага двара, арганізаваць дапамогу з боку калгасаў і саўгасаў, якія скончылі сваю сяўбу, маламоцным індывідуальным гаспадаркам, шырока растлумачыць сярод індывідуальнікаў пункты закону аб с.-г. падатку наконт вызваленьня ад падатку паваляічаных супроць мінулага году плошчаў засеву і ўсе іншыя мерапрыемствы, якія забясьпечваюць поўны засэў яравога кліну і пашырэньне засэўнай плошчы, дабіваючыся ўсьведамленьня ва ўсёй партарганізацыі таго, што ў БССР пры наяўнасьці большасьці бядняцка-сярэдняцкіх гаспадарак, якія не ўвайшлі ў калгасы, выкананьне пляну сяўбы індывідуальнікамі зьяўляецца важнейшай задачай на бліжэйшы пэрыяд.

6. Перавыбары парторганаў і справаздачную кампанію праводзіць пад пунктам далейшай мабілізацыі ўсёй партыйнай арганізацыі навакол асноўных задач калгаснага будаўніцтва і правядзеньня веснавой сяўбы, пад пунктам сьмелага бальшавіцкага выкрываньня памылак і скажэньняў лініі партыі, скарыстаўшы перавыбары ў максымальнай меры ў мэтах рашучага ўзмацненьня ўсіх кіраўнічых органаў Магілеўскай партарганізацыі.

Пасьля веснавой сяўбы заслухаць паведамленьне Магілеўскага АК аб выкананьні дырэктыў ЦК і праведзеных Магілеўскім акругкомам мерапрыемствах па ўзмацненьні калгаснага будаўніцтва.

Узмацнім партыйнае кіраўніцтва сацспаборніцтвам

Забясьпечым пагалоўны ўдзел камуністых ва ўдарным руху

Кожны партыйны калектыў павінен стаць арганізатарам барацьбы за прамфінплян — гэта баявая катэгарычная дырэктыва партыі. Аднак, ня ўсе партыйныя арганізацыі кіруюць як сьлед сацыялістычным спаборніцтвам, ударным рухам. Ня ўсюды яшчэ камуністы сталі на чале ўдарнага руху. Ёсьць факты, калі камуністы, нават, не ўваходзяць ва ўдарныя брыгады, праяўляючы гэтым самым правы апартунізм на практыцы.

Факты з месц, выразна аб гэтым гавораць.

Нічога ня зроблена па інструментальна-мэблявай фабрыцы (Віцебск) у галіне разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. З боку кіраўніцтва фабрыкі наглядаецца недаацэнка значэньня спаборніцтва і ўдарніцтва. Сакратар парт'ячэйкі на пасяджэньні вытворчай нарады аднойчы кажа: «дзе тут можа быць сацспаборніцтва і ўдарніцтва, калі няма сыр'ю». Наогул, з боку партыйнай ячэйкі няма ніякага кіраўніцтва ўдарнікамі, ніякай культурна-выхаваўчай работы сярод ударнікаў не вядзецца. Прамфінплян не даведзены ішчэ да цэху, да брыгад, да рабочых.

Абутковая фабрыка імя Ленерта лічыць сябе ўдарнай. Паводле вестак, ударніцтвам ахоплена 88 проц. усяе колькасьці рабочых. Прамфінплян выкананы толькі на 86,5 проц., а ў першым квартале — яшчэ менш.

Асноўнай прычынай такога становішча зьяўляецца адсутнасьць кіраўніцтва з боку парт'ячэйкі сацспаборніцтва і ўдарніцтвам. Ударныя брыгады пры заключэньні саздагавораў у большасьці ня бралі на сябе канкрэтных абавязацельстваў.

Сацыялістычнае спаборніцтва ў арматурным цэху заводу «Пралетары» не адчуваецца. Ударныя брыгады працуюць бяз усякага кіраўніцтва з боку партыйнай ячэйкі і заўкому. Працдысцыпліна на заводзе паслабла. Спазьненьні на работу павялічыліся, а сярод спазьняўшыхся нямала камуністых.

Транспарт зьяўляецца вузкім месцам у нашай народнай гаспадарцы. Мы маем рад прарываў у выкананьні прамфінпляну на транспарце, а сацыялістычным спаборніцтвам на транспарце ахоплена ўсяго 50 проц. рабочых. Гэта сьведчыць аб тым, што партыйныя арганізацыі ішчэ не даволі разагнулі работу па ўцягненьні рабочых у сацыялістычнае спаборніцтва і ва ўдарныя брыгады.

Гэтыя факты выразна гавораць аб тым, што партыйныя арганізацыі ў радзе месц ішчэ ня здолелі стаць на чале ўдарнага руху, што ў радзе месц партыйныя арганізацыі замест перабудовы свае работы так, каб стаць на чале магутнага вытворчага ўдыму рабочых мас па выкананьне прамфінпляну.

Тым, што асобныя вытворчыя партыйныя араганізацыі замест перабудовы партыйнай і масавай работы ў адпаведнасьці з новымі тэмпамі і задачамі цягнуцца ў хвасьце ізнаходзяцца ў палоне старых мэтадаў і форм работы, у вялікай ступені тлумачацца зрывы плянавых заданьняў на некаторых прадпрыемствах.

Кожная вытворчая партарганізацыя павінна безадкладна на справе выканаць дырэктывы партыі аб ліквідацыі гаспадарчых прарываў і аб перавыкананьні прамфінплянаў. Кожная вытворчая партарганізацыя павінна перабудаваць сваю работу у адпаведнасьці з новымі тэмпамі работы, каб забясьпечыць выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. Трэба рашуча ўдарыць па камуністых-хвосьціках. Трэба забясьпечыць пагалоўны ўдзел камуністых ва ўдарных брыгадах.

Р.

ТЫДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАЙ літаратуры і мастацтва ў Маскве

(Гутарка з прадстаўніком камісіі па правядзеньні тыдня т. Шукайла)

У мінулым годзе ў Маскве быў праведзены тыдзень украінскае літаратуры і мастацтва. Вынікі правядзеньня тыдню былі лепшым доводам таго, што сувязь паміж расійскай пралетарскай літаратурай і украінскай узмацнілася і дасягненьні гэтых абедзьвюх галін культуры сталі вядомы шырокім колам рабочых і сялян. Разам з гэтым, пашырылася інтэрнацыянальнае выхаваньне. У гэтым годзе з 1-га па 7-га мая ў Маскве арганізуецца тыдзень беларускага мастацтва і літаратуры. Для падрыхтоўкі і правядзеньня тыдня створана камісія з прадстаўнікоў урадавых устаноў, літаратурных, мастацкіх і грамадзкіх арганізацый. У склад камісіі ўвайшлі: старшынёю камісіі тав. ФЭЛІКС КОН і членамі т. т.: ЛУНАЧАРСКІ (ЦВК СССР), ТАДЖЫЕЎ (Савет Нацыянальнасьцей ЦВК СССР), МАРОЗАЎ (ЦВК РСФСР), КЕРЖАНЦАЎ (Кам. Акадэмія), ШУКАЙЛА (Кам. Акадэмія), ХАЛАТАЎ (ДВыдат РСФСР), СУТЫРЫН (ВОАПП), СЕЛІВАНОЎСКІ (РАПП), ВОСІПАЎ, ЭЦІНГОФ (Фэдэрацыя), АЛЬХАВЫ («Літ. Газэта»), ШАМАРДЗІНА (ЦК Рабіс), ІОНАЎ (ЗІФ), БАТРАК (Т-ва сялянскіх пісьменьнікаў), БЭСКІН (Літ. Энцыкляпэдыя) і інш. Апрача таго, у камісію ўваходзяць прадстаўнікі газэт: «Правда», «Известия» і «Комсомольская Правда».

Рабочы прэзыдыум абраны ў складзе т. т.: ФЭЛІКСА КОНА, ЭЦІНГОФА, ВОСІПАВА, ШУКАЙЛЫ і СЕЛІВАНОЎСКАГА.

На апошнім пасяджэньні камісіі былі вынесены пастановы, якія вызначаюць парадак правядзеньня тыдня. Пастаноўлена, каб дэлегацыя ў складзе 80 асоб (мастакі, пісьменьнікі, артыстыя) прыехала ў Маскву 30 красавіка а 5-6 гадзіне дня. Дэлегацыю на вакзале спаткаюць прадстаўнікі літаратурных, мастацкіх і прафэсыянальных арганізацый. А 7 гадз. вечара, у памяшканьні клюбу пісьменьнікаў, адбудзецца першае спатканьне беларускіх таварышоў з прадстаўнікамі расійскага мастацтва і літаратуры.

1-га мая дэлегацыя будзе прымаць удзел у дэманстрацыі разам з расійскімі пісьменьнікамі і мастакамі. 2-га мая — урачыстае пасяджэньне ў Камуністычнай Акадэміі з дакладам аб беларускай літаратуры, з выступленьнямі беларускіх пісьменьнікаў, артыстых і г. д. 3-га мая — партыйная нарада ў Аддзеле Культуры і Прапаганды ЦК. Вечарам урачысты сход у ЦЭКУБУ. 4-га мая — вялікі вечар у Капёвнай залі Дому Саюзаў. 5-га мая, удзень, — нарада з выдавецтвамі і нарада з прадстаўнікамі тэатру, вечарам — удзел у правядзеньні «Дня друку». 6-га мая — прыём у прадстаўніноў ураду, вечарам — экскурсіі і тэатр. 7-га мая — вечар падагуленьня вынікаў тыдня.

Камісія пастанавіла камандыраваць свайго прадстаўніка тав. ШУКАЙЛУ ў Менск для наладжаньня сувязі з беларускай камісіяй па падрыхтоўцы гэтага тыдня, а таксама прасіць камісію выпучыць свайго прадстаўніка для ўзгадненьня пытаньняў, зьвязаных з працай абедзьвюх камісій. Зараз маскоўскія арганізацыі і прэса распачынаюць вялікую кампанію па папулярызацыі беларускага мастацтва і літаратуры. Для кіраўніцтва гэтай кампаніяй вылучаны тав. АЛЬХАВЫ (прэса), ВІНАКУРАЎ (радыё), РАФЭС (кіно). Выдавецтва «Фэдэрацыі» друкуе папулярную брашуру аб беларускай літаратуры. Выдавецтва (Тео-Кино-Печать) выдае некалькі партрэтаў і паштовак беларскіх пісьменьнікаў.

Задача беларускіх арганізацый — грунтоўна падрыхтавацца да правядзеньня гэтага тыдня, які мае вялізарнае значэньне.

Нельга блытаць!

Тэта было ў Менскім чыгуначным клюбе імя Леніна на дыспуце, прысьвечаным разбору кнігі Зарэцкага «Падарожжа на новую зямлю». Дыспут праводзіўся ячэйкай камсамолу чыгуначных школ сацвыху.

Партыйная ацэнка нацыянал-дэмакратычнага твору Зарэцкага «Падарожжа на новую зямлю», як літаратурнай аналёгіі кулака, не знайшла свайго адлюстраваньня на гэтым дыспуце. Уступнае і заключнае слова кіраўніка дыспуту настаўніка Маеўскага не адпавядала паказаной ацэнцы. Некаторыя камсамольцы (Лічко, Левін і інш.) кваліфікавалі твор Зарэцкага, як «голас беларуса наогул», «голас працоўных». Падобныя выступленьні зьяўляюцца нічым іншым, як абаронай варожай нам сутнасьці гэтага твору Зарэцкага.

І калі настаўніца Фідроўская разам з падрыхтаванымі ёю вучнямі, прабавала даць правільную ацэнку твору, яна атрымала адпор ад некаторых камсамольцаў і ад самога кіраўніка дыспуту настаўніка Маеўскага, які ў заключным слове ўзяў пад абарону выступленьні Лічко, Левіна і інш.

І вось пасьля такога дыспуту «Чырвоная Зьмена», замест таго, каб даць адпор няправільным выступленьням, якія там мелі месца, газэта зьмясьціла допіс пад загалоўкам «Палітычная ўстаноўка настаўніцы Фідроўскай», у якім ацэніла кую ацэнку твору Зарэцкага», дзе прыстаўніцы Фідроўскай.

Аўтары, сказіўшы ў допісе выступленьне настаўніцы Фідроўскай, прышыкмеціла» нацыянал-дэмакратычнай сутнасьці, твораў самабытнасьці ў творы Зарэцкага. Між тым, «Ч. З.» не магло быць невядомым скажэньне сэнсу прасьведчаньняў (у прыватнасьці, ліст члена партыі Путніна, лісты Фідроў-скай, канспэкты выступленьняў яе вучняў) аб тым, што сэнс выступленьня Фідроўскай не разыходзіўся з ацэнкай твору, данай нашым партыйным друкам. Фідроўская, аналізуючы сымбалічныя вобраз чарота ў творы Зарэцкага, сьлядзіла на тым, што куснамі аўтара ў вобразе чарота гаворыць кулак (а не «адкрыта аб кулаку», як падкрэсьлівае «Ч. З.» у сваёй папраўцы да допісу).

Аб тэндэнцыйным падыходзе «групы камсамольцаў» да выступленьня настаўніцы Фідроўскай гаворыць ішчэ і тое, што аўтары, апісваючы дыспут, зусім ня спыніліся на тых сапраўды шкодных выступленьнях настаўніка Маеўскага, камсамольцаў Лічко, Левіна і інш. — якія былі на дыспуце.

Мы маем усе падставы сказаць аб тым, што палітычная ўстаноўка Фідроўскай была якраз правільнай. Надварот, няправільнай і шкодная была «ўстаноўка» артыкула ў «Ч. З.», які блытаў чытача ў разуменьні клясавых (адрозьніваньне ідэалёгіі нацыянал-дэмакратызму ад ідэалёгіі кулака).

«Ч. З.» павінна была даць правільную прынцыповую ацэнку дыспуту. Замест гэтага, пасьля зьмяшчэньня няправільнага артыкулу «групы камсапраўкай», якая па сутнасьці ўнесла толькі блытаніну. У такіх пытаньнях, як барацьба з нацыянал - дэмакратызмам, ня можа быць месца «гонару мундзіру». Гэта трэба зразумець «Ч. З.» і выпраўіць сваю памылку.

Трэба таксама партыйнай ячэйцы ФЗВ чыгуначнікаў заняцца спрасай наладжаньня адносін паміж камсамольскай ячэйкай і настаўнікамі школ сацвыху. Гэтыя адносіны, як заявіў нам рад настаўнікаў, у тым ліку настаўнікаў-камуністых, у чыгуначнай школе, зусім ненармальныя.

К. С.

Абураючыя факты цкаваньня селькора Раманькова

У свой час паведамлялася ў газэце «Зьвязда» (№ 51 ад 2-III 1930 г.) аб цкаваньні селькора т. Раманькова з Магілёўшчыны. Па гэтай справе выяжджала спэцыяльная камісія ад ЦКК-РСІ БССР для расьсьледваньня фактаў цкаваньня і выяўленьня вінаватых у гэтай агіднейшай справе.

Перад намі зараз матар'ялы камісіі ЦКК-РСІ па расьсьледваньні справы селькора Раманькова, рэдакцыя газэты «Зьвязда» лічыць патрэбным больш падрабязна асьвятліць гэту справу на старонках газэты.

Былы сакратар Лупалаўскай райземкамісіі Раманькоў—актыўны савецкі грамадзкі працаўнік і селькор. З 1922 да 1928 году быў старшынёю Мастоцкага сельсавету. Тав. Раманькоў, як селькорэньнем, патравамі, хуліганствам, ледпадатку і захаваньнем зброі і дзяржаўнай маемасьці прыватнымі асобамі.

Сярод усіх «пакрыўджаных» селькорам Раманьковым асоб—і былы член ЦВК БССР, моцны сярэдняк, Карыткін Базыль, у якога Раманькоў выкрыў утоеную зямлю і самагонны апарат. Усе гэтыя асобы пачыналі супроць т. Раманькова і ўсялякімі мерамі імкнуліся скампрамэтаваць яго, вышукваючы ўчынкі ў яго мінулым.

За ўсю вышэйпералічаную работу Раманькоў у 1925 годзе пастановаю Лупалаўскага РВК, па заяве Карыткіна Базыля, быў пазбаўлен выбарчых правоў і дэтэрміновa выведзен са складу Мастоцкага сельсавету, дзе ён быў сакратаром. Але па яго скарзе акруговая выбарчая камісія ў хуткім часе ў выбарчых правох яго адмаўляла. Нарэшце, як працяг прасьледваньня Раманькова за крытыку, быў паданы на яго ў розныя органы рад кампрамэтуючых матар'ялаў (у судова-сьледчыя органы, камісіі па чыстцы савецкага апарату), на падставе якіх супроць Раманькова былі ўзбуджаны судовыя справы і ён быў выдалены з камісіі па чыстцы з бюро.

Раманькова дапусьцілі цэлы рад грубейшых памылак. Так, напрыклад, нарсуд г. Магілеву, атрымаўшы заяву гр-на Воўкава аб зьнявазе яго Раманьковым на перавыбарчым сходзе, няправільна заявіў судовую справу і без выкліку Раманькова, які знаходзіўся ў той час пад вартай, вырашыў справу заочна, прыг

Прывітаньне ЦК КП(б)Б і яго ЦО „Зьвязьдзе"

Першая нарада рэдактароў фабрычна-заводзкіх шматтыражных газэт Беларусі шле палкае пралетарскае прывітаньне арганізатару і кіраўніку сацыялістычнага будаўніцтва Беларусі, непахіснаму праваднику генэральнай лініі партыі — Цэнтральнаму Камітэту КП(б)Б і яго Цэнтральнаму органу «Зьвязьдзе».

Зараз краіна ўступіла ў адзін з важнейшых, адзін з адказьнейшых этапаў сацыялістычнага будаўніцтва, які патрабуе максымальнай згуртаванасьці радоў КП(б)Б, найбольшай напружанасьці, энэргіі і сіл пралетарыяту з тым, каб выканаць грандыёзьнейшыя задачы па індустрыялізацыі краіны, калектывізацыі сельскай гаспадаркі, будаўніцтве нацыянальнай пралетарскай культуры.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі бальшавікоў рабочая кляса Беларусі дабілася вялізарнейшых посьпехаў.

Растуць новыя прамысловыя гіганты. Гудзі магутных электрастанцый будзяць вякамі спаўшыя нэтры.

Ахопленыя хваляй сацыялістычнага спаборніцтва — ударніцтва рабочыя масы паказваюць нябачаныя дагэтуль тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, прыклады камуністычных адносін і арганізацыі працы.

Батрацтва і беднота ў саюзе з серадняком пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго бальшавіцкай партыі выйшлі на шырокі шлях суцэльнай калектывізацыі і на аснове яе ліквідацыі кулацтва як класы.

Добра ўсьвядомляючы ўсю велічыню і адказнасьць стаячых задач, пэўна разумеючы аграмадную ролю савецкага друку ў галіне мабілізацыі энэргіі мас на вырашэньне важнейшай зараз задачы — выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі, мабілізацыя мас на непрымірымую барацьбу з адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі — з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай, і «левымі» загібамі, канцэнтруючы адначасова агонь на самым небясьпечным зараз — нацыянал-дэмакратызьме і шавінізмах усіх колераў, рашуча змагаючыся з скажэньнямі партыйнай лініі і перагібамі ў калгасным будаўніцтве, бязьлітасна б'ючы па шкодніцтве, бюракратызьме, чыноўніцтве, рвацтве— першая нарада рэдактароў фабрычна-заводзкіх шматтыражных газэт запэўніе ЦК КП(б)Б, што пастаўленыя задачы перад шматтыражкамі яны па прыкладзе ЦО ЦК КП(б)Б «Зьвязды» пабальшавіцку выканаюць.

Няхай жыве непахісны праваднік генэральнай ленінскай лініі партыі ЦК КП(б)Б!

Няхай жыве яго баявы орган «Зьвязда»!

На барацьбу за прамфінплян

САКАВІК ДАЎ НЕКАТОРАЕ ПАЛЯПШЭНЬНЕ,

аднак пералом невыстарчальны

АСАБЛІВА ДРЭННА СА ЗЬНІЖЭНЬНЕМ САБЕКОШТУ

НАПРУЖЫЦЬ УСЮ ЭНЭРГІЮ ДЛЯ ВЫКАНАНЬНЯ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЯ ПРАМФІНПЛЯНУ!

Барацьба за выкананьне прамфінпляну, мабілізацыя вакол гэтага пытаньня ўвагі ўсяе грамадзкасьці, новы ўздым ударніцтва і сацспаборніцтва прынесьлі ў сакавіку некаторы ўзрост прадукцыі.

Паводле нялоўных матар'ялаў можна канстатаваць, што валавая прадукцыя ў сакавіку дае ўзрост НА 14 ПРОЦ. Усяго за першае паўгодзьдзе валавая прадукцыя, якая складае па цэнах 1926-27 году каля 129 млн. руб., у параўнаньні з адпаведным пэрыядам мінулага году, паказвае павялічэньне НА 71 ПРОЦ. Такім чынам, супроць вынікаў за 5 месяцаў, якія далі павялічэньне прадукцыі на 69,4 проц., мы маем некаторае паляпшэньне колькасных паказьнікаў, якое ўсё-ж ПОЎНАСЬЦЮ НЕ ПАКРЫВАЕ ТАГО ПРАРЫВУ, ШТО МЕЎ МЕСЦА НА ПРАЦЯГУ ПЕРШАГА КВАРТАЛУ. Аб гэтым выразна сьведчыць той факт, што праграма за першае паўгодзьдзе выканана ўсяго НА 93,6 ПРОЦ.

Другі квартал у параўнаньні з першым дае павялічэньне прадукцыі на 11,5 проц. Гэты ўзрост ідзе галоўным чынам за кошт апошніх ДВУХ МЕСЯЦАЎ, пераважна сакавіка, ЯКІ МОЖНА НАЗВАЦЬ ПЕРАЛОМНЫМ.

У паасобных галінах прамысловасьці вынікі першага паўгодзьдзя характарызуюцца наступнымі данымі.

Вытворчая праграма па МЭТАЛЁВАЙ прамысловасьці выканана на 89 проц., што ў параўнаньні з вынікамі за 5 месяцаў (86,9 проц.) дае некаторыя паляпшэньні.

ШКЛЯНАЯ прамысловасьць выканала вытворчую праграму на 91 проц. Сакавік перавысіў сярэднюю пічбу за 5 месяцаў на 6 проц.

ТЭКСТЫЛЬНАЯ прамысловасьць у сакавіку паказвае значны прырост — 27 проц., але за першае паўгодзьдзе вытворчая праграма выканана ў разьмеры 82,7 проц.

ШВЭЙНАЯ прамысловасьць выканала праграму за паўгодзьдзе поўнасьцю.

СКУРАНА - АБУТКОВАЯ выканала праграму на 86 проц., пры чым сакавік перавысіў сярэднюю пічбу першых 5-ці месяцаў на 24 проц.

ПАПЯРОВАЯ прамысловасьць паказвае ў сакавіку прырост прадукцыі на 21 проц., што дало магчымасьць выканаць праграму за першае паўгодзьдзе на 99,1 проц.

Значны рост прадукцыі маем і па ЗАПАЛКАВАЙ прамысловасьці, якая ў сакавіку дала больш, чым у лютым на 23,5 проц., але вытворчая праграма за паўгодзьдзе выканана ўсяго на 97,8 проц.

Зусім невыстарчальны прырост дае ХАРЧОВАЯ прамысловасьць. Усяго за першае паўгодзьдзе вытворчая праграма выканана ў разьмеры 92 проц.

Вынікі работы прамысловасьці за сакавік лішні раз пацьвярджаюць, што невыкананьне прамфінпляну за першае паўгодзьдзе НІЯКІМ ЧЫНАМ НЕЛЬГА АДНЕСЬЦІ ЗА КОШТ АБ'ЕКТЫЎНЫХ ФАКТАРАЎ. Даволі было разварушыць масы, падштурхнуць апарат прамысловасьці, як гэта адбілася на рабоце прамысловасьці. Работу сакавіка можна расцэньваць, як больш-менш здавальняючую. Але прымаючы пад увагу далёка нездавальняючыя вынікі першых 5-ці месяцаў, работа ў сакавіку на фоне прарыву НІЯКІМ ЧЫНАМ НЯ МОЖА НАС ЗАДАВОЛІЦЬ.

Да таго-ж, найбольш важная дырэктыва бягучага году, дырэктыва АБ ЗЬНІЖЭНЬНІ САБЕКОШТУ яшчэ ня выканана. Замест 11 проц. сабекошт за 5 месяцаў (без дрэваапрацоўчай прамысловасьці, па якой яшчэ няма вестак) зьніжаны ўсяго НА 7 ПРОЦ.

Па радзе галін прамысловасьці мы маем зусім ганебныя пічбы зьніжэньня сабекошту. БАВАЎНЯНАЯ прамысловасьць замест зьніжэньня сабекошту на 13,7 проц. зьнізіла яго толькі на 2,5 проц. (пічбы за 5 месяцаў), СУКОННАЯ — замест 14,6 — на 1,4, СКУРАНА - АБУТКОВАЯ замест 12 проц. — на 4,1, ЗАПАЛКАВАЯ — замест 12 проц. — на 2,1, МАХОРАЧНАЯ замест 6,2 проц. — на 0,9, АКУЛЯРНАЯ за 4 месяцы замест 20,5 проц. — на 9,3 проц.

Пад пагрозай знаходзіцца выкананьне дырэктывы аб зьніжэньні сабекошту па ДРЭВААПРАЦОЎЧАЙ прамысловасьці, якая замест 6,2 проц. зьнізіла сабекошт толькі на 2 проц. Адстаюць ад плянавых заданьняў МЭТАЛЁВАЯ і ПАПЯРОВАЯ прамысловасьць. На зусім добра справіліся з задачай зьніжэньня сабекошту ХАРЧОВАЯ, ШКЛЯНАЯ і ПАЛІГРАФІЧНАЯ прамысловасьць.

Сур'ёзным недахопам зьяўляецца таксама няўпасьць вялікага процанту браку і прастояў у вытворчасьці. Больш таго. Па некаторых прадпрыемствах наглядаецца нават тэндэнцыя павялічэньня браку.

Тэхнічны кантроль за такім важным момантам выкананьня прамфінпляну, як ПАЛЯПШЭНЬНЕ ЯКАСЬЦІ ПРАДУКЦЫІ, знаходзіцца не на належнай вышыні.

Вынікі работы прамысловасьці за сакавік і першае паўгодзьдзе ставяць пераднамі наступныя задачы.

Трэба ва ўсю шырыню паставіць пытаньне аб неадкладным узмацненьні тэхнічнага кіраўніцтва. Апошняя пастанова ЦК УсеКП(б) аб кіраўніцтве прадпрыемствамі ставіць перад прамысловасьцю рад канкрэтных задач, сярод якіх, асабліва ва ўмовах БССР, мае вялізарнае значэньне павышэньне тэхнічнага ўзроўню адміністрацыйнага пэрсаналу.

Адначасова з гэтым трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на складаньне нармальнага працоўнага рэжыму на прадпрыемствах. Пастанова ЦК УсеКП(б) дае рад канкрэтных прапаноў, якія неабходна зараз-жа правесьці ў жыцьцё.

Трэба дабіцца рашучага пералому ў рабоце паасобных цэхаў, выразна паставіўшы пытаньне аб адзіначальні.

Слаба ідзе работа па праверцы сацспаборніцтва. Адміністрацыйна - тэхнічны пэрсанал на радзе прадпрыемстваў не зразумеў яшчэ поўнасьцю значэньня сацыялістычных мэтадаў работы.

А. ШУЛЬМАН.

Усебеларуская канфэрэнцыя рэдактароў заводзкіх шматтыражак

ЧАГО ЧАКАЕ ЗАВОДЗКІ ДРУК

Больш кіраўніцтва з боку цэнтральных і мясцовых газэт, а таксама партарганізацый

Спрэчкі па дакладах т.т. Васкабойнікава і Курціка

13-га красавіка на ранішнім пасяджэньні з дакладам аб задачах нізавога друку ў барацьбе за прамфінплян выступіў тав. Курцік. Даклад тав. Курціка будзе зьмешчаны ў заўтрашнім нумары «Зьвязды». Па дакладах т.т. Васкабойнікава і Курціка разгарнуліся шырокія спрэчкі.

Тав. ІЛЬЛІНА (панчошная фабрыка—Віцебск) адзначае вялікі рост зацікаўленасьці рабочых і работніц да шматтыражак.

— Мы дабіліся таго,—кажа прамоўца,—што работніцы, якія раней газэты амаль не чыталі, зараз ня толькі чытаюць, але і пішуць у яе. Нават сярод няпісьменных работніц у нас ёсьць кадры рабкорак. Яны приносяць нам матар'ял у вусной форме, або просяць каго-небудзь напісаць яго. Тав. Ільліна выказваецца за існаваньне чырвонай і чорнай дошак. На яе думцы, гэтыя дошкі даюць вельмі вялікую карысьць як у адносінах выкананьня прамфінпляну, так і ў адносінах вучобы. У нас на фабрыцы — даказвае прамоўца — правільнасьць сваёй думкі — гэтыя дошкі дапамаглі давесьці наведваньне мяткаў гурткоў і школ да 75 проц.

Тав. Рыжын (член рэдкалегіі Віцебскай заводзкай газэты «Ударнік») казаў аб тым, што ў членаў рэдкалегіі слабая тэарытычная падрыхтоўка, што «Віцебскі Пралетары» ня кіруе рабкораўскім рухам, што масавая работа развалілася. Віцебская друкарня больш 70 дзён затрымлівае друкаваньне заводзкіх газэт.

Тав. Жылінскі (Добруская папяровая фабрыка) адначыў, што газэта амаль зусім не мае дапамогі ад цэнтральных і акруговых газэт, што ў ёй няма моцнага рабкораўскага ядра.

Ад імя маскоўскай «Рабочей Газеты» вітаў канфэрэнцыю тав. Рымскі, які заклікаў заводзкія газэты палкам аддаць сябе на службу прамфінпляну.

Ад імя Асоавіяхіму канфэрэнцыю вітаў камандзір №-скай дывізіі т. Лакцінёнаў, які ў сваім слове адзначыў аб тым, што заводзкія газэты мала ўвагі зварачаюць на вайсковую працу, што вайсковая работа ў некаторых газэтах вагоча не асьвятляецца.

Тав. Якаўлеў (газэта «Рабочий») вітае дэлегатаў нарады ад імя рэдакцыі.

Тав. Вержбаловіч (газэта «Зьвязда») кажа аб слабым партыйным кіраўніцтве шматтыражкамі. Згодна ўстаноўкі 4-й нарады рабселькораў і вышэйшых партыйных арганізацый, партячэйкі на мясцох павінны заслухоўваць справаздачы рэдкалегій і даваць далейшы напрамак у рабоце. Пакуль што рэалізацыя гэтай прапановы больш-менш праводзілася ў Віцебску. Аднак, і тут кіраўніцтва з боку партячэек досыць слабое.

Нарэшце, тав. Вержбаловіч адзначае, што на заметкі рабкораў гаспадарчыя арганізацыі вельмі слаба рэагуюць. ВСНГ павінен больш, чым хто-небудзь іншы, сачыць за прапановамі рабкораў. Аднак, пакуль што гэтага канстатаваць нельга. Амаль ні адна з шматтыражак не дабілася яшчэ сваячасовага рэагаваньня на заметкі.

Наогул у спрэчках запісалася 35 чал., выказалася калі 30 чал.

З заключнымі словамі выступілі т.т. Васкабойнікаў і Курцік, якія адказалі на ўсе запытаньні дэлегатаў.

Тав. Курцік адзначыў, што беларусізацыя ва ўсіх шматтыражках стаіць на нізкім узроўні, што трэба многае зрабіць, каб беларусізаваць заводзкі друк.

* * *

Нарада атрымала прывітальную тэлеграму ад слуцкай раённай калгаснай газэты «Ленінскі Шлях».

Дзеньнік канфэрэнцыі

На ранішнім пасяджэньні 14-га красавіка быў заслуханы даклад тав. ГАРУНОВІЧА: «Партмасавая работа на прадпрыемствах».

Тав. КЛІМКОВІЧ зрабіў даклад на тэму: «Перабудова прафсаюзнай работы на прадпрыемстве ў цэху і задачы шматтыражкі».

Па дакладах выказалася 9 чалавек.

Тав. ВІЦІНСКІ зрабіў інфармацыю аб парадах рабселькораў і вышэйшых партыйных арганізацый, партячэйкі на мясцох павінны заслухоўваць справаздачы рэдкалегій і даваць далейшы напрамак у рабоце. Пакуль што рэалізацыя гэтай прапановы больш-менш праводзілася ў Віцебску. Аднак, і тут кіраўніцтва з боку партячэек досыць слабое.

Тав. ШОК (завод «Чырвоны Мэталіст», Віцебск) адзначае слабое кіраўніцтва рабкорамі. У мінулым годзе ў Віцебску адбылася акруговая канфэрэнцыя рабселькораў. Да гэтага часу яшчэ не надрукаваны рэзалюцыі канфэрэнцыі.

Тав. Дварсон спыняецца на недахопах работы шматтыражак. Асноўным недахопам зьяўляецца тое, што нашы газэты на сёнешні дзень яшчэ не пераключылі ўсёй сваёй работы на барацьбу за прамфінплян. Газэты не мабілізавалі свайго рабкораўскага актыву вакол барацьбы за выкананьне і перавыкананьне вытворчых праграм. Газэты наогул не вядуць ніякай работы сярод рабкораў. Возьмем хоць-бы такое пытаньне: ці ўсе нашы рабкоры зьяўляюцца ўдарнікамі. На жаль, на гэтае пытаньне мы станоўча адказаць ня можам.

Тав. Чарняк адзначыў, што некаторыя трэсты прымаюць слабы ўдзел у барацьбе за прамфінплян.

Тав. Скараходаў (віцебская ф-ка абутку) выказвае думку, што на фабрыцы неабходна арганізаваць друкаваную шматтыражку. На фабрыцы працуе 950 чал., насьценная газэта ня можа задаволіць патрэбнасьці такой вялікай колькасьці рабочых.

Тав. Гонікман. Мы вельмі няўважліва падыходзім да падбору членаў рэдкалегій друкаваных газэт. Адсюль розныя палітычныя памылкі на старонках шматтыражак. Члены рэдкалегій і рэдактары шматтыражак часта маюць вялікую нагрузку і ня могуць справіцца з работай. Чамусьці мясцовыя арганізацыі лічаць работу рэдкалегій другарадным.

Тав. Майзэльс. Трэба лічыць, што нарада рэдактароў шматтыражак створыць пэўны пералом у адносінах кіраўніцтва гэтымі газэтамі. Да гэтага часу партыкіраўніцтва шматтыражкамі было пастаўлена дрэнна.

Слова—майстром кухні

18 красавіка — гарадзкая канфэрэнцыя кухароў

Ходам агляду грамадзкага харчаваньня вынулена, што адно з галоўных патрабаваньняў спажыўца — гэта паляпшэньне якасьці грамадзкага харчаваньня. Патрабаваньне яснае — даць рабочаму спажыўцу спажыўны, смачны і недарагі абед.

Залежыць гэта якасьць у першую чаргу ад органаў забясьпечваючых і загатоўчых. Сваячасовае забясьпечэньне сталовых патрэбнай колькасьцю добраякасных прадуктаў адыгрывае вялікую ролю ў справе паляпшэньня якасьці абедаў.

Але надзвычай многа фактаў гаворыць за тое, што і пры поўным забясьпечэньні прадуктамі, якасьць абедаў, як агульнае зьявішча, усё-ж дрэнная. Гэта прымушае нас зьвярнуць цэнтр сваёй увагі на вытворчы вучастак грамадзкага харчаваньня — на кухню.

Мы ставім пытаньне так, што кухары — гэта кваліфікаваныя майстры на прадпрыемстве. І да іх трэба прад'явіць усе патрабаваньні аб паляпшэньні якасьці прадукцыі, як і да майстроў усякае іншае вытворчасьці.

Запечаныя і засмажаныя ў стравах прусакі, пацукі, цьвікі, шкло і дрэва — ёсьць прадукт або простага шкодніцтва або злачыннай нядбайнасьці.

Пытаньне аб кадрах у грамадзкім харчаваньні стаіць вельмі востра, іх няма. Але і сярод наяўных кухараў і сярод улітара ў іх асяродзішча маладзіняка ёсьць некаторая колькасьць падрыхтаваных і добрасумленных работнікаў, якія могуць і павінны стаць актывістымі ў барацьбе за якасьць.

На агульнагарадзкую канфэрэнцыю кухараў, якая склікаецца на 18 красавіка, камандны склад кухні павінен прыйсьці з канкрэтнымі прапановамі, як паляпшыць якасьць грамадзкага харчаваньня. Усе моманты, якія тармозяць паляпшэньне якасьці, павінны быць выкрыты самімі кухарамі. Не замазваць, а самакрытычна выкрыць усе свае недахопы. Выгнаць шкодніка-ў і кухонных манжэнаў з апарату грамадзкага харчаваньня — задача дня, частка практычнай работы па агляду грамадзкага харчаваньня.

Справіцца з гэтай задачай грамадзкасьць здолее толькі пры актыўнай дапамозе саміх кухараў.

С.

У баку ад агляду

Фабкомы ня выконваюць пастаноў прэзыдыуму ЦСПСБ

Пасьпяховае праведзеньне агляду грамадзкага харчаваньня магчыма толькі пры ўмове ўдзелу шырокіх рабочых мас. Аднак, фабзаўмясцкомы «Камунара», «Чырвонай Зары», «Чырвонага Тэкстыльшчыка» і швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» гэтага не ўявілі і нічога не зрабілі для ўцягненьня рабочых у гэту справу.

Фабзаўмясцкомы ў аглядзе ня прымаюць удзелу. Некаторыя фабзаўмясцкомы абараняюць сваю бязьдзейнасьць аб'ектыўнымі прычынамі: «іншыя кампаніі перашкаджаюць».. («Чырвоная Зара» і «Чырвоны Тэкстыльшчык»).

Яны ня ведаюць, колькі чалавек працуе ў брыгадах на абсьледваньні сталовых (ф-ка «Кастрычнік»).

Брыгада заводу «Чырвоная Зара» яшчэ не зрабіла вывадаў, ня гледзячы на тое, што ўжо некалькі раз абсьледвала сталоўку заводу «Энэргія». Прымацаваныя да брыгады заводу «Камунар» доктар Лушкевіч і рахункавод Мінакер на прадпрыемства нават не зьяўляюцца.

Фабком ф-кі «Чырвоны Тэкстыльшчык», яшчэ нічога не зрабіўшы, ужо «почил на лаврах». Ён нават ня ведае, які аб'ект для праверкі прымацаваны да яго.

— У нас няма ніякіх дырэктыў,—кажа тав. Шнейдэрман, — нам іх ня прысылалі, а магчыма, што гэтыя дырэктывы заваляліся ў дзяжурнага міліцыянэра...

Заўкомы «Камунара» і «Чырвонай Зары» абмежаваліся кароткай інфармацыяй на агульных сходах рабочых, а ФЗМК «Чырвонага Тэкстыльшчыка» і «Кастрычніка» нават і гэтага не зрабілі.

Брыгады складаюцца з 5—7 чалавек, такім чынам, уся маса рабочых ізалявана ад агляду. Фабзаўмясцкомы павінны шырэй разгарнуць сваю працу па аглядзе грамадзкага харчаваньня.

Ц—с.

Біць па вінаватых у дрэннай якасьці прадукцыі

ПРАФАРГАНІЗАЦЫІ МАЛА ЦІКАВЯЦЦА ГЭТЫМ ПЫТАНЬНЕМ

У ГАРБАРНА-АБУТКОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ РАСЬЦЕ БРАК

Яшчэ да гэтага часу на паляпшэньне якасьці прадукцыі зварачаецца вельмі мала ўвагі.

— Калі мы патрабуем выканаць вытворчую праграму, дык нельга патрабаваць якасьці прадукцыі,—так разважаюць некаторыя майстры на прадпрыемствах Скурпрэсту.

Слабое рэагаваньне адміністрацыі на дрэнную якасьць прадукцыі прыводзіць да павялічэньня браку. Так. напрыклад, па гарбарні «Бальшавік» выхад фабрыкату з сырцу з кожным месяцам памяншаецца. Калі выраслі ў сьнежні дае 15,3 проц. недавыхаду дык сакавік даў ужо 18,8 проц. Па наўскурніку недавыхад яшчэ больш—у сьнежні 18,3 проц., у сакавіку—25,1 проц. І гэта ў той час, як, паводле пляну, разьбежка паміж сырцом і выхадам дапускаецца ня звыш 13 проц.

Калі перавесьці гэтыя страты на грошы, дык на аднэй гарбарні «Бальшавік» страчана на дрэннай якасьці прадукцыі каля 20.000 руб. Між іншым, гарбарня «Бальшавік» працуе горш за іншыя гарбарні. Больш за ўсё скаргаў на прадукцыю гарбарні «Бальшавік».

У рабоце гарбарні «Бальшавік» былі выпадкі, калі цэлыя партыі скур псаваліся. У гэтым, галоўным чынам, вінавата цэхавая адміністрацыя, з боку якое няма выразнага кіраўніцтва.

Вінаваты таксама прафсаюзныя і партыйныя арганізацыі, якія амаль заўсёды робяць упор на колькасьць, забываючы зусім пра якасьць прадукцыі.

Тое самае назіраецца на абутковай фабрыцы ў Менску. Тут, як і па «Бальшавіку», працэсы ціпліна не на вышыні, майстры не зварачаюць увагі на якасьць, прафарганізацыя не завастрае ўвагі рабочых вакол неабходнасьці паляпшаць якасьць прадукцыі. Усё гэта спрыяла таму, што брак павялічыўся ў параўнаньні з мінулым годам з 0,64 проц. да 2,28 проц.

Яшчэ больш павялічыўся брак на віцебскай абутковай фабрыцы: за 5 месяцаў брак дасягае 5,04 проц., а за 10 дзён красавіка — 7,99 проц.

Страты ад браку па абутковых фабрыках складаюць дзесяткі тысяч рублёў.

Абутковыя фабрыкі да гэтага часу мелі сваіх бракераў, якія часта шкадавалі паасобных рабочых, што давалі нядобраякасную прадукцыю. Зараз уводзіцца новы парадак: бракеры будуць пастаўлены Скурсындыкатам, якія напэўна будуць больш патрабаўнымі.

Гарбарня «Бальшавік» пераводзіцца на гаспадарчы разьлік. Гэта дасьць магчымасьць павялічыць адказнасьць майстроў і адміністрацыі за якасьць прадукцыі.

Але ўсіх гэтых мерапрыемстваў мала. Трэба, каб прафсаюзныя арганізацыі ўсю палітыка-масавую і культурна-выхаваўчую работу прыстасавалі да аднэй з асноўных задач выкананьня прамфінпляну—паляпшэньня якасьці прадукцыі.

А. М.

Агляд грамадзкага харчаваньня

У РАБОЧЫХ РАЕНАХ МЕНСКУ АДКРЫВАЮЦЦА ДЗЕСЯТКІ НОВЫХ СТАЛОВЫХ

Новыя сталовыя абслужаць яшчэ 17.500 працоўных

Не дапусьціць зрыву будаўніцтва рабочых сталовых

ВСНГБ зусім ня цікавіцца аглядам грамадзкага харчаваньня

Ужо ня раз адзначалася, што існуючая сетка сталовых па Менску ахапляе толькі 10 процантаў працоўных, што ні ў якім разе ня можа задаволіць узрастаючых запатрабаваньняў.

У парадку правядзеньня агляду грамадзкага харчаваньня трэба было зараз-жа ўжыць рад практычных мерапрыемстваў да павялічэньня сеткі сталовых.

Гэтыя мерапрыемствы прымаюцца. МЦРК у бягучым годзе мяркуе адкрыць каля 20 новых сталовых, якія ахопяць новых 17 з паловай тысяч рабочых спажыўцоў; гэта ўзьніме процант абслугоўваньня рабочых грамадзкім харчаваньнем да 30. Будаўнічым плянам МЦРК прадугледжана ахапіць важнейшыя рабочыя вучасткі гораду Менску.

Апарат ЦРК сваімі сіламі з гэтай вельмі цяжкай задачай справіцца ня можа. Галоўныя труднасьці ўпіраюцца ў адсутнасьць патрэбнага абсталяваньня.

Ня гледзячы на тое, што сродкамі гэтае будаўніцтва забясьпечана і гэтай справай зацікаўлен рад адказных устаноў і арганізацый, адкрыцьцё сталовых пад пагрозай, бо няма пліт, кухоннага начыньня, адаправсду, тэрмасаў і іншага патрэбнага абсталяваньня.

Спробы набыць абсталяваньне ў Маскве і Ленінградзе вынікаў не далі. І ня дзіва, бо такое-ж узмоцненае будаўніцтва разгортваецца па ўсім Савецкім Саюзе, попыт на абсталяваньне расьце ўсюды і надзеі на атрыманьне абсталяваньня па-за межамі БССР няма.

Ясна, што будаўнічыя і гаспадарчыя цэнтры БССР ужо даўно павінны былі гэта ўлічыць і прыстасаваць некаторыя прадпрыемствы для вырабу абсталяваньня рабочых сталовых (яшчэ невядома, чым скончыўся попыт з заводам «Камунар», які пачаў рабіць тэрмасы).

ВСНГ у гэтых адносінах праяўляе ўпартую бязьдзейнасьць. Яшчэ да сёнешняга дня агляд грамадзкага харчаваньня праходзіць міма яго, што пядаўна было адзначана слацыяльнай пастановай прызыдыуму ЦСПСБ, які запрапанаваў сэктару вытворчасьці зацікавіцца ўдзелам органаў ВСНГ у аглядзе.

Пагроза зрыву будаўнічага пляну МЦРК прымушае нас СПЫТАЦЦА Ў ВСНГ — ці зацікаўлен ён аглядам грамадзкага харчаваньня і які практычны ўдзел у ім ён будзе прымаць?

Мы павінны сёньня давесьці ВСНГ простыя ісьціны, што агляд грамадзкага харчаваньня зьяўляецца барацьбою за павышэньне рэальнай зарплаты рабочых, за павышэньне прадукцыйнасьці працы, за палягчэньне выкананьня прамфінпляну.

Калі гэтыя моманты ВСНГ хоць крыху датычаць, ён павінен зараз-жа ўжыць рад практычных захадаў да таго, каб будаўніцтва рабочых сталовых у Менску ня было сарвана.

Сетка рабочых сталовых у гэтым годзе значна пашыраецца

Грамадзкім харчаваньнем будзе ахоплена новых 17.500 ч.

Паводле прадугледжанага пляну, у бягучым годзе ў Менску будзе пабудаваны рад новых сталовых.

1-га мая адкрываецца сталовая пры пабудове дому ўраду, якая будзе ахапляць 1.000 сэзонных рабочых, сталовая—разьмеркавальнік абедаў па прадпрыемствах і на дом тэрмасамі на 3.000 чалавек, летняя сталоўка ў садзе «Прафінтэрн»—на 1.000 чал.

15-га мая будуць адкрыты: сталовая ў садзе заводу «Пралетары» на 800 чал., такая-ж сталовая на Старажоўцы — на 400 чал., пры цагельні № 2—3 дзьве сталовыя на 200 чал., № 8 — 200 чал., у лягерах дзьве сталовыя на 300 чал. кожная, на цагельні № 1 — на 800 чал. і пры Менбудзе — на 1.000 чал.

1 чэрвеня: сталовая пры торфараспрацоўках на 300 чал., і 1-га жніўня будуць адкрыты дзьве сталовыя на сельска-гаспадарчай выстаўцы на 6.500 чал.

Гэты будаўнічы плян забясьпечаны сродкамі і пры яго выкананьні абслугоўваньне рабочых Менску павялічыцца на 200 проц., параўнальна з цяперашнім, і ахопіць новых 17.500 рабочых спажыўцоў.

Тэорыя прафілактыкі

Нядаўна адбыўся сход навуковых работнікаў Горацкай с.-г. акадэміі, дзе абмяркоўвалася пытаньне аб працэсе над украінскай контр-рэвалюцыйнай арганізацыяй «СВУ» на чале з «акадэмікам» Яфрэмавым.

Якую-ж ацэнку даў дакладчык прафэсар Кайгарадаў гэтаму важнаму факту? Большая частка яго дакладу складалася з газэтных цытат, судовай хронікі, якія ўсім вядомы. Дакладчык зрабіў вельмі кароткія, але надзвычай навучальныя вывады. Вось яны:

Тое, што лепшая частка інтэлігенцыі (дакладчык потым агаварыўся, што лепшую ён разумее не па сваіх маральных якасьцях, а па іх навукова-тэхнічнай каштоўнасьці) трапіла на лаўку падсудных, паказвае, што сярод інтэлігенцыі ёсьць нездаровыя зьявішчы. Гэтыя нездаровыя зьявішчы нараджаюцца, па яго думцы, тым: 1) што няма таварыскай згуртаванасьці паміж навуковымі работнікамі, няма маральнай згуртаванасьці; 2) што лепшая частка інтэлігенцыі задыхаецца, ня можа сябе праявіць у рабоце, няма з кім пагаварыць і параіцца і г. д.

І як агульны вывад: 3) патрэбны прафілактычныя меры для таго, каб зрабіць магчымым больш актыўны ўдзел гэтай лепшай (па думцы дакладчыка) часткі інтэлігенцыі ў савецкай рабоце.

У дакладзе ня было і намёку на клясавы аналіз прычын, штурхаючых рэакцыйную частку інтэлігенцыі ў лягер шкодніцтва і контр-рэвалюцыі; няма і намёку на патрабаваньне суровае кары ім, няма закліку да актыўнай дапамогі навуковых работнікоў у сацыялістычным будаўніцтве.

Разьбярэм па парадку тлумачэньні прафэсара Кайгарадава.

На Украіне «лепшая» частка інтэлігенцыі трапіла на лаўку падсудных. Тут, у нас, і наогул у СССР, «лепшая» частка інтэлігенцыі задыхаецца. Згодзімся з праф. Кайгарадавым, што «лепшая» адносіцца не да іх маральна-палітычных якасьцяй, а да іх навукова-тэхнічнай каштоўнасьці. Што-ж азначае такое цьверджаньне? Гэта азначае нішто іншае, як тое, што ў СССР няма, быццамбы, умоў для плённай работы навуковых работнікаў і наогул «лепшай» часткі інтэлігенцыі. Але дамо гэтым «лепшым» інтэлігентам, нескромнае пытаньне: чым тлумачыць, што асноўная маса інтэлігенцыі прымае актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве? Мабыць, гэта ня лепшая частка інтэлігенцыі, а горшая? Дык хто-ж тады ў нас будуе Волхаўбуд, Днепрабуд, чыгункі, заводы-гіганты, паводле найноўшай тэхнікі? Усё гэта, па іх думцы, горшая частка інтэлігенцыі, а ня лепшая частка бяз двукосьсю.

Асноўныя масы інтэлігенцыі ў СССР ня ўлюць кракадзіляньі сьлёз аб «душнай» абстаноўцы, не патрабуюць прафілактычных мер для стварэньня сабе «адпаведных» умоў для работы. Гэта частка інтэлігенцыі добрасумленная і упартай работай на сацыялістычным будаўніцтве, рука аб руку з пралетарыятам, пад кіраўніцтвам кампартыі, сапраўды творыць і ўсе неабходныя умовы для плённай работы. Адсюль зразумела, што некаторыя адзінкі, якія лічаць сябе «лепшай» часткай інтэлігенцыі, не знаходзяць сабе таварыства для маральнае згуртаванасьці. Гэта і зразумела. Сапраўдная згуртаванасьць навуковых работнікаў можа адбывацца не на маральнай аснове «наогул», а на аснове сапраўднай станоўчай праграмы работы пад кіраўніцтвам пралетарыяту і камуністычнай партыі.

Дагнаць і перагнаць у тэхнічных адносінах перадавыя капіталістычныя краі, выканаць пяцігодку за чатыры гады, змагацца за прамфінплян, за калектывізацыю бяднацкай і серадняцкай гаспадаркі, за перамогу сацыялізму — вось плятформа для устаўленьня сапраўднае згуртаванасьці навуковых інтэлігенцыяй, з аднаго боку, і паміж інтэлігенцыяй і пралетарыятам—з другога. Хто гэтага ня хоча, той сапраўды будзе «задыхацца», ці правільней, выдыхацца ў савецкай атмасфэры.

Але ёсьць адзін выхад, па думцы прафэсара Кайгадарава—гэта прафілактыка. Аднак, дамо зноў скромнае запытаньне: да каго адносіцца прафілактыка? Ці-ж да гэтай «лепшай» часткі інтэлігенцыі, якая прагне ўдзельнічаць у сацыялістычным будаўніцтве і ёй непатрэбна перашкаджае? Але яна ня «лепшая», дзе паводле апошніх вынікаў, якая прафілактыка-ж ёй не патрэбна. Застаецца адно: прафілактыка адносіцца да таго асяродзішча, якое акружае гэту «лепшую» частку інтэлігенцыі і зьвязвае яе па руках і нагах. Каранцей гаворачы, прафілактыка адносіцца да савецкага і партыйнага асяродзішча, якое бязумоўна мае зусім іншыя маральныя асновы і з якім ня можа мірыцца гэта «лепшая» частка інтэлігенцыі.

Па думцы прафэсара Кайгадарава савецка-партыйнае асяродзішча перашкаджае гэтай «лепшай» часткі інтэлігенцыі правяць актыўнасьць. Вось чаму высоўваецца тэорыя прафілактыкі, якая тэарытычна згрунтавана «нейтральнасьць», пакуль ня будуць створаны «адпаведныя» умовы.

Савецкая ўлада ня мае патрэбы ў прызнаньні «дэ-юрэ», бо сапраўды лепшая частка інтэлігенцыі даўно ужо кінула таптацца ў баку «нейтральнасьці» і добрасумленна выконвае свой абавязак перад пралетарыятам.

Пралетарыят умее цаніць сапраўды лепшую частку інтэлігенцыі, якая актыўна ўдзельнічае ў сацыялістычным будаўніцтве. Пралетарыят здолее адзначыць на заслугах і гую частку «лепшай» інтэлігенцыі, якая фігуры ў працэсе «СВУ».

І. ДОЛІН.

Партыйцы, якія прыймалі ўдзел у гэтым сходзе навуковых работнікаў, прывільна выкрылі шкодны характар тэорыі прафілактыкі. Да сяк-так адарвалі далучылася частка беспартыйных навуковых работнікаў.

І. Д.

ТАННУЮ ГАРОДНІНУ—РАБОЧАМУ НАСЕЛЬНІЦТВУ

Белсадсаюз ня выканаў пляну арганізацыі гароднікіх гаспадарак

СЕЛЬКОРЫ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА СЯЎБЫ

Рабочая брыгада Чарэйскага раёну (Аршаншчына) сыгналізуе аб прарывах у падрыхтоўчай рабоце да сяўбы. Райа і паляводства зусім не падрыхтаваліся да веснавой засеўнай кампаніі. Аграмінімум і мінімум не даведзены да кожнага насельніка. Сяляне **Гіпянскага, Лукамскага, Сьлідчанскага і Стражавіцкага** сельсаветаў амаль зусім ня рыхтуюцца да сяўбы. Аўтастанцыя **Матар'ялу** праходзіць злачынна павольна, машыны стаяць на некалькі дзён. Ільнастаніць у вёсцы **Стражовічы**, прыбярэзная, трактарыстка **Чарэйскі раёна** ня ведае, колькі ачышчана засеўнага матар'ялу. Па некаторых сельсаветах ачышчана ўсяго 25-30 проц. Большасць калгасаў ня ведае свайго яравога кліну.

На новы статут далёка ня ўсе калгасы пераведзены.

Студэнт **Буцько** піша, што кулакі павялі шалёную агітацыю сярод сялян аб выхадзе з калгасу ў гэтым раёне. Кулацкая агітацыя не сустракае належнага адпору з боку раду мясцовых работнікаў.

У **Плешчаніцкім раёне** (Менпшчына) — піша тав. **Чэчотка** — працаўнікі РВК ня прымаюць належных мер да замацаваньня арганізаваных калгасаў. Справа з падрыхтоўкай да сяўбы стаіць дрэнна.

Па **Амсьціслаўскім раёне** — піша рабкор — засеўны матар'ял, які ссыпаны ў агульныя сьвірны, не ачышчаны. Рабочыя пляны ня складзены. Не адведзена зямля тым гаспадаркам, якія не ўвайшлі ў калгасы. Рабочая скаціна не абагулена. Не папулярызаваны сярод насельніцтва новы закон аб ільготах на сельска-гаспадарчым падатку.

У **Хабленскім** сельсавеце, **Юраўіцкага раёну** (Мазыршчына)—паведамляе селькор **Аса** — яшчэ з восені арганізаваўся калгас, на чале якога стаў былы кіраўнік маёнтку «Старч», нехта **Лявіцкі Кірыла**, і павёў падрыхтоўчую работу. Вышаўшы сам з калгасу, падгаварыў тое самае зрабіць і некаторых калгасьнікаў.

Там, дзе мясцовыя арганізацыі павялі шырокую растлумачальную работу сярод сялянства, папулярызавалі новыя ільготы і мерапрыемствы Савецкага ўраду, падрыхтоўка да сяўбы значна пасунулася наперад.

Менскі прыгарадны калгас **«Прабуджаны агароднік» і калгас імя Дзяржынскага**, — піша тав. **Сарока**, — да сяўбы падрыхтаваны як мае быць. У калгасе імя Дзяржынскага абагулена насеньне, адрамантаваны плугі, бароны і інш. сельска-гаспадарчыя машыны. Калгас «Прабуджаны агароднік» падрыхтаваўся засеяць морквай 15 гэктараў, капустай — 16, буракамі — 8, агуркамі — 6 і г. д. Насеньне, цягавая сіла і машыны падрыхтаваны.

Калгас **«Прамень Сацыялізму»**, Крапівенскага сельсавету (Аршаншчына)— піша рабочая брыгада — забясьпечаны насеньнем. Сельска-гаспадарчыя машыны рамантуюцца. Дрэнна, аднак, тое, што РВК не паклапаціўся аб прысылцы зямляўпарадчыка і агранома.

У калгасе **«Новае Угонішча»** (Глускі раён), паведамляе **«Калгасьнік»**, ёсьць зрух у рабоце. Рамантуюцца машыны, загатаўляецца насеньне.

Ул. Б.

Бібліяграфія

Масавая літаратура для рабочага чытача

Беларсяржвыдавецтва выдала за апошні час рад кніжак па пытаньнях масавай вытворчай работы на прадпрыемствах, на выкананьні прамфінпляну.

Капусьцін — **«Ўношу прапанову на агляд»**, стар. 45, цана 12 кап.; **Раманаў** — **«Чаму і як трэба ўзьнімаць прадукцыйнасьць працы»**, стар. 60, цана 15 кап.; **Мікулін** — **«Спаборніцтва мас»**, стар. 71, цана 15 кап.; **Карклін** — **«Выкананьне пляну сацыялістычнага будаўніцтва — шлях да вырашэньня харчовых цяжкасьцяй»**, стар. 38, цана 18 кап.; **Струмілін** — **«Сацыяльныя праблемы пяцігодкі»**, стар. 75, цана 20 кап.

Брашура **«Ўношу прапанову на агляд»** **Капусьціна** ставіць мэту паказаць на падставе досьледу, як практычна арганізаваць грамадзка-вытворчы агляд на прадпрыемствах. Бязумоўна, брашура зьяўляецца вельмі каштоўнай для нашых прадпрыемстваў, дзе слаба разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва, слаба паставлена масавая работа па рацыяналізацыі вытворчасьці. Добра арганізаваны агляд, як паказала практыка ўсесаюзнага агляду некалькіх буйнейшых ленінградскіх фабрык, прынясе добрыя вынікі. Паказваючы, як канкрэтна арганізаваць і правесьці агляд прадпрыемства, кніжка зьяўляецца добрым дапаможнікам у арганізацыі агляду.

Кніжка **Раманава «Чаму і як трэба ўзьнімаць прадукцыйнасьць працы»** працуе ў папулярнай форме растлумачыць працоўным масам неабходнасьць узьнімаць прадукцыйнасьці работы і якім чынам. Гэта спроба зьяўляецца ня зусім удалай. Кніжка перасыпана лічбамі і радавому чытачу (на якога яна разьлічана) цяжкавата. Раманаў прымушае лічбамі ўтаўляць наш розум і толькі месцамі прабуе тлумачыць больш простай мовай, як палепшыць прадукцыйнасьць працы. Патрэбнымі ўмовамі палепшэньня прадукцыйнасьці працы трэба лічыць, па Раманаву, узьнятае працоўнай дысцыпліны, вышпчэньне пракулаў, актывізацыя вытворчых нарад, вынаходніцтва і інш., што ў асноўным зьяўляецца правільным. Але Раманаў надаючай малае жесца аддае сацыялістычнаму спаборніцтву — галоўнейшай умове па павышэньні прадукцыйнасьці працы — асноўнага мэтаду нашай работы.

Брашура **Мікуліна «Спаборніцтва мас»** зьяўляецца адной з лепшых кніжак па пытаньнях сацыялістычнага спаборніцтва. Удала падабраны фактычны матар'ял разам з простым і пераканаўчым тонам, апавядае нам пра вялікі энтузіязм мас, які выліўся ў сацыялістычным спаборніцтве цэхаў, заводаў, фабрык. Лепшай анцэкай гэтай кніжкі зьяўляецца прадмова да яе т. Сталіна, у якой ён піша: «каштоўнасьць гэтай брашуры ў тым, што яна складае простае і праўдзівае апавяданьне пра тыя глыбокія працэсы вялікага працоўнага ўздыму, што складаюць унутраную сутнасьць сацыялістычнага спаборніцтва». Гэту кніжку можна і трэба горача рэкамэндаваць рабочаму чытачу. Мастацкае афармленьне кніжкі добрае. Цана невялікая. Усяго 15 кап.

Карклін — «Выкананьне пляну сацыялістычнага будаўніцтва — шлях да вырашэньня харчовых цяжкасьцяй». Кніжка паказвае тое вялікае кола эканамічных пытаньняў, якія ахапляе пяцігодка. Пяцігодка прадугледжвае кожны крок нашага жыцьця. Ад пасьпяховасьці выкананьня пяцігодкі залежыць і вырашэньне харчовых цяжкасьцяй, якія адчуваюцца цяпер у нас. Кніжка гэта каштоўная зьместам, мае шмат матар'ялаў, якія датычаць БССР. Той, хто хоча азнаёміцца, як будуць вырашаны харчовыя цяжкасьці, той павінен прачытаць кніжку Каркліна.

Кніжка **«Сацыяльныя праблемы пяцігодкі» Струміліна** зьяўляецца спробай у сьціслай, але дакладнай форме перадаць энэргетыку нашай краіны. Аўтар кніжкі ўзяў за аснову тры галоўныя праблемы пяцігодкі: праблему працы, накапленьне, праблему рынку. Лічбы і фактычны матар'ял (17 табліц) робяць кніжку для радавога чытача даволі цяжкай. Кніжка, як відаць, разьлічана на *сярэдняга чытача, для якога яна можа прынесьці вялікую карысьць у справе азнаямленьня з сацыяльнымі праблемамі пяцігодкі.*

ДАКУТОВІЧ.

Вынікі месячніка ашчаднасьці

Гэтымі днямі адбылося пасяджэньне цэнтральнай камісіі салдзейнасьці дзяржкрэдыту і ашчаднасьці пры ЦВК. На парадку дня стаялі даклады аб выніках месячніка ашчаднасьці ў БССР, аб безнаяўных разьлічках і рэалізацыі вэлёсьлядных абавязацельстваў.

Камісія адзначыла, што **месячнік ашчаднасьці праведзены ў БССР нездавальняюча. Заданьні выкананы толькі на 43 проц.** Прафсаюзныя, савецкія і партыйныя арганізацыі прымалі слабы ўдзел у месячніку зьбіраньня. Таксама слаба цікавіліся правядзеньнем месячніка і некаторыя АВК, РВК і сельсаветы. Было таксама адзначана, што актыўнасьць працоўных мас гораду і вёскі ў часе месячніка была даволі значная.

А. М.

Як працуюць вылучэнцы-чыгуначнікі

Нядаўна ў чыгуначным клюбе імя Леніна адбыўся сход вылучэнцаў-чыгуначнікаў разам з рабочымі, на якім прысутнічала каля 1.000 чалавек. Рабочыя-вылучэнцы выступалі з індывідуальнымі дакладамі-справаздачамі аб сваёй рабоце ва ўстановах. З дакладаў выявілася, што некаторыя гаспадарчыя ўстановы і прафсаюзныя арганізацыі няўважліва адносіліся да вылучэнцаў. Напрыклад тав. **Стахаў**, вылучаны на пасаду ўпоўнаважанага ТПО, спаткаў няўважлівыя адносіны да сябе з боку адміністрацыі. Тав. **Скопа**, вылучанага ў члены праўленьня Белкаапсаюзу, адміністрацыя ганяла з аднаго месца ў другое.

Прыблізна-ж па тое самае скардзіўся тав. **Зінаў** і іншыя вылучэнцы.

Сход пастанавіў для павышэньня кваліфікацыі вылучэнцаў арганізаваць спэцыяльныя курсы. Прызнана таксама патрэбным палепшыць інструктаваньне вылучаных таварышоў і забясьпечыць іх адпаведнай літаратурай.

Культпроп. Аршанскага АК КП(б)Б разам з АПБ склікае ў горадзе і на чыгунцы на 17 і 18 красавіка два шырокіх сходы чытачоў «Зьвязды», рабкоў раў разам з культкамісіямі мясцкомаў.

Парадак дня: 1. Даклад рэдакцыі газ. «Зьвязда», 2. Гаспадарчае будаўніцтва і задачы рабкораў. 3. Плян правядзеньня Дня друку.

МЕНСК



Праект залі пасяджэньняў у Доме Ураду

Скончыць пабудову выстаўкі да 15-га мая

СНК прапанаваў дырэкцыі ўсесаюзнай выстаўкі і Белдзяржбуду скончыць поўнасьцю ўсё будаўніцтва выстаўкі, унутраную і знадворную апрацоўку і афарбоўку павільёнаў не пазьней 15-га мая г. г.

Дырэкцыі выстаўкі прапанава, апрача сталовай на 1.500 чалавек, якая будуецца на тэрыторыі выстаўкі, пабудаваць яшчэ адну частковую сталовую, якая магла-б абслужыць 5.000 чалавек.

Ліквідацыя камітэту будаўніцтва

СНК пастанавіў ліквідаваць камітэт будаўніцтва пры Эканомнарадзе і функцыі яго разам з апаратам перадаць у Дзяржплян. У складзе апошняга арганізуецца будаўнічы сэктар.

Харчовая прамысловасьць перадаецца Наркамгандлю

Савет Народных Камісараў БССР пастанавіў перадаць усе прадпрыемствы харчовай прамысловасьці, за выключэньнем броваравў, з-пад кіраўніцтва ВСНГБ пад загад Наркамгандлю.

Больш рабочых—на курорты

У Менск прыехаў доктар **Дондыш**, камандыраваны Адэскім курортным кіраўніцтвам для папулярызацыі курортнай справы сярод рабочых БССР.

Прыезд выкліканы тым, што паводле дырэктыў вышэйшых партыйных і прафэсыянальных арганізацый 75 проц. месц на курортах павінна быць запоўнена рабочымі ад барыятаў.

У мэтах прыцягненьня рабочых на курорты, Адэскае курортнае кіраўніцтва дае рабочым шырокі крэдыт. Доктар Дондыш аб'ездае ўсе буйныя гарады БССР і на рабочых сходах прачытае даклады аб курортах Адэсчыны.

Забясьпечыць с.-г. фасфарытнай мукой

СНК БССР прапанаваў ВСНГ прыняць рашучыя меры да неадкладнага пуску крычаўскага фасфарытнага заводу і нападзіць работу клімавіцкага млыну ў 3 зьмены. СНК даручыў НК РСІ высьветліць прычыны, чаму затрымаўся сваячасовы пуск фасфарытных млыноў.

Хто плаціць за навучаньне ў школах

СНК БССР скасаваў сваю пастанову ад 2-га лютага 1926 г. аб прыцягненьні бацькоў вучняў да дапамогі школе. Працоўны элемэнт зусім вызваляецца ад платы за навучаньне ў школах сацвыху. За навучаньне ў школах плацяць толькі асобы непрацоўных катэгорый, сяляне, якія плацяць с.-г. падатак у індывідуальным парадку, і саматужнікі, якія пазбаўлены выбарных праў з прычыны эксплёатацыі наёмнай рабочай сілы.

Платнасьць не пашыраецца на дзяцей непрацоўнага элемэнту, якія вучацца ў 4-хгодках (1-шы канцэнтр 7-мігодкі) і ў школах 1-й ступені. Пастанова будзе праведзена ў жыцьцё з новага навучальнага году.

Пад суд—за зрыў мерапрыемстваў па засеўнай кампаніі

Менаддзяленьне Белкаапсаюзу пастанавіла **распусьціць** праўленьні **Дамавіцкага і Каменаборскага** спажывецкіх таварыстваў за зрыў аспэўных мерапрыемстваў па засеўнай кампаніі. Справа перадаецца сьледчым органам. За невыкананьне плянаў затавак засеўных траў і плянаў кантрактацыі жывёлы аддаецца пад суд праўленьне Новадворскага спажывецкага таварыства.

Прыём у Камвуз Беларусі на 1930-31 год

Пастановаю ЦК КП(б)Б Камвуз Беларусі рэарганізуецца з 30-31 навучальнага году. Пачынаючы з 1 курсу будуць існаваць 3 аддзяленьні:

Аддзяленьне партбудаўніцтва, якое рыхтуе кіраўнічыя кадры для партработы ў райкомах, буйных фабрычных ячэйках, ячэйках калгасаў і саўгасаў. Тэрмін навучаньня 3-хгадовы.

Аддзяленьне савецкага будаўніцтва рыхтуе партыйныя кадры для кіруючай работы ў РВК і АВК. Тэрмін навучаньня 3-гадовы.

Прапагандысцкае аддзяленьне рыхтуе агітпрапаротнікаў, выкладчыкаў па грамадзка - палітычных дысцыплінах для СНШ, марксысцка - ленінскіх гурткоў павышанага тыпу, тэхнікумаў і інш. Тэрмін навучаньня **3-хгадовы.**

Апрача 3-х асноўных аддзяленьняў пры Камвузе будуць існаваць 2-хгадовыя курсы:

а) **Арганізатараў нарасьветы** — падрыхтоўка партыйных кадраў для кіраўнічай работы па народнай асьвеце ў раёнах.

б) **Курсы газэтных работнікаў**—падрыхтоўка рэдактароў шматтыражных калгасных газэт і загадчыкаў аддзеламі рэдакцый.

На 1930-31 год зацьверджан наступны ліч. набору: у аддзяленьне партбудаўніцтва — 150 асоб, аддзяленьне савецкага будаўніцтва — 60 асоб, аддзяленьне прапагандыстых—60 асоб, арганізатараў нарасьветы — 60 асоб, курсы газэтных работнікаў—30 асоб.

Усяго на ўсе аддзяленьні і курсы будзе прынята **360 чал.**

Разьмеркаваньне месц па акругах наступнае:

Акруга.	На асноўныя аддзяленьні	На курсы	
		Газэтныя.	Нарасьветы
1. Менская .	60	8	12
2. Гомельская.	55	8	12
3. Бабруйская.	45	6	10
4. Магілеўская.	40	6	8
5. Полацкая .	35	4	6
6. Аршанская.	40	4	6
7. Мазырская.	35	4	5
8. Віцебская .	50	8	12
	360	48	71

Увага: пры выкананьні раскладу АК КП(б)Б улічваюць ужо камандыраваных раней паводле папярэдніх раскладаў гэтага году.

Для ўсіх асноўных аддзяленьняў правілы прыёму застаюцца ранейшыя (надрукаваны ў «Зьвязьдзе» № 3 ад 4/1—1930 г.).

Падзел па аддзяленьнях (пасьля прыёму) у Камвузе.

Для паступаючых на курсы ў бліжэйшы час будуць даны асобныя правілы прыёму.

Заявы павінны быць пасьля зацьверджаньня ў АК КП(б)Б дасланы ў камвуз не пазьней 1 жніўня.

Прыймовыя іспыты—з 20 па 27 жніўня 1930 г.

Пачатак заняткаў з 1 верасьня.

Загадчык Культпроп. ЦК КП(б)Б СЯНКЕВІЧ.

Рэктар камвузу САЕВІЧ.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЕНЬНЯ

Дом Камасьветы. Ад 19 да 21 гадз. — індывідуальная кансультацыя тав. **Доўгапова** па антырэлігійнай прапагандзе (пак. № 21).

— У 19 гадз. (пак. № 3) заняткі гурткa нямецкай мовы.

Рэсп. бюро АРУ (Савецкая, 65). У 18 з паловаю гадз. нарада актыву с.-г. сэктару АРУ сумесна з рахунковымі працаўнікамі-добраахвотнікамі і брыгадзірамі, якія зьявяцца з часовае працы ў калгасах.

Пэдгабінэт. У 19 гадз. — канфэрэнцыя 1-х груп.

Клюб Навуковых Працаўнікоў. Пасяджэньне т-ва валўнічых матарыялістых - дыялектыкаў. Спрэчкі па дакладу тав. **Бурстына.** Пач. у 20 гадз.

Пэдалёгічны аддзел Ін-ту пэдагогікі і пэдалёгіі запрашае пэдалёгаў, працаўнікоў і дактароў школьных, дашкольных устаноў і дзіцячых дамоў на пасяджэньне. Пач. у 20 гадз. у памяшканьні Ін-ту (прыродазнаўчы корпус БДУ, 3 паверх). Парадак дня: Плян працы пэдалёгіі і 2. Экскурсія па лябараторыях катэдры рэфлексалёгіі і пэдалёгіі БДУ.

БДУ. У 19 гадз. (актавая заля) літар. дыспут на тэму: «Задачы пралетарскай літаратуры ў рэканстр. перыяд». Дакл. тав. **Бэндз.** У дыспуце прымаюць удзел прадстаўнікі ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМ, пісьменьнікі і навуковыя працаўнікі. Пасьля дыспуту вечар.

Пасяджэньне ўсебелар. т-ва нэўрапатал. і псыхіятр. (нэўра-псых. сэкцыя нав. асацыяцыі) у пам. нэрв. клінікі. Пач. у 20 з пал. гадз. Парадак дня. 1. Дэманстрацыя хворых і 2. М. Хазанаў—эпідэм. энцэфаліт. на Беларусі.

Заняткі краязнаўчых курсаў — у 18 гадз. у памяшканьні прыродазнаўчага корпусу БДУ (3 паверх аўд. 1). Лекцыі: 1. Вывучэньне рэлігійных настрояў і антырэлігійнага руху (акад. Вальфсон). 2. Вывучэньне рэвалюцыйнага руху.

Дом Асьветы. Нарада бюро ячэек Асавіяхіму разам з культмасавымі групамі актыву групкомаў і МК саюзу працасьветы па пытаньні аб ваенізацыі. Пач. у 19 гадз. Запраш. асоавіяхімаўскі актыў і менскія асьветнікі.

Дом Санасьветы. У 19 гадз. — пасяджэньне Мен. Акр. к-ту па барацьбе з алкагалізмам. Яўка членаў к-ту і бюро антыалкагольных ячэек, а таксама прадстаўнікоў заўкомаў тых прадпрыемстваў, дзе антыалк. ячэйкі не арганізаваны, абавязкова.

Мен. АК ЛКСМ адкрывае **дом адпачынку,** які будзе існаваць з 15 мая па 15 жніўня. Усе эканомпрацаўнікі павінны падаць у АК ЛКСМ сьпісы таварышоў, што жадаюць паехаць у дом адпачынку. Тэрмін падачы заяў з 15 красавіка па 1 мая. Сьпісы прымаюцца па нядзелях, серадах і пятніцах ад 17 да 20 гадз.

ЗАЎТРА

Клюб дрэваапрацоўшчыкаў (Савецкая, 125). Агульны сход служачых і рабочых. Пач. у 19 гадз.

Клюб саматужнікаў. У 19 гадз. адкрыты сход парткалектыву Белсампрамсаюзу. Парадак дня: 1. Дакл. аб сакавіковым пленуме ЦК КП(б)Б, 2. Праверка члена партыі тав. **Курчанка** і 3. Выбары на райпартканфэрэнцыю. Пач. у 19 гадз.

Дом Асьветы. У 20 гадз. адкрыты сход парткалектыву КП(б)Б працасьветы. Даклад аб выніках пленуму ЦК КП(б)Б. Запрш. менскія асьветнікі.

— У 19 гадз. партыйцы ячэйкі працасьветы павінны зьявіцца ў БАП для ўдзелу ў чыстцы члена ячэйкі **Бененсона.**

БДУ (актавая заля). Адкрыты партыйна-камсамольскі сход пэдфаку. Парадак дня: 1. Чарговыя задачы па калектывізацыі і 2. Выбары дэлегатаў на райпартканфэрэнцыю. Запраш. студэнцтва.

Біржа працы паведамляе, што ў зьвязку з разгортваньнем будаўнічага сэзону праца ў будаўнічай сэкцыі будзе вясьціся з 8 гадз. да 12 гадз. дня. У гэты час будзе рабіцца першапачатковая рэгістрацыя, прыём на вучот і пасылка на працу. Пасылка на працу будзе рабіцца таксама і з 3 да 5 гадз. дня.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Да ведама ўсіх устаноў і прадпрыемстваў

Пастанова Наркамату РСІ БССР

ад 15 сакавіка 1930 г.

Радам устаноў не захоўваецца парадак у адносінах талёнаў да разьліковых ведамасьцяй, якія прадстаўляюцца страхавальнікамі ў страхкасы. Гэта не дае магчымасьці Дзяржпляну ажыцьцявіць устаноўленую дзяржплянам і ўзгодненую з НК РСІ сыстэму вучоту колькасьці і зарплаты асоб наймовай працы. У мэтах зьнішчэньня ў будучым недахопаў у распусьціўленьні гэтай справаздачнасьці, НАРКАМАТ РСІ ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Ускласьці на акр. органы сац. страхаваньня:

а) праверку стат. талёнаў разьліковых ведамасьцяй шляхам бягучай апэрацыйнай працы касы;

б) адказнасьць за добраякаснасьць стат. талёнаў і сваячасовае выпраўленьне сустракаючыхся ў іх памылак.

2. Страхавальнікі, якія аб'яднаюць некалькі ўстаноў і прадпрыемстваў—абавязаны прадстаўляць два разы ў год адначасова з талёнамі разьліковых ведамасьцяй, пералік усіх ім аб'яднаных устаноў і прадпрыемстваў, пік работнікаў па кожным з іх, суму заработнай платы, належачай ім і месца іх знаходжаньня.

3. Зьвярнуць увагу АВК на неабходнасьць сваячасовага прадстаўленьня РВК сьпісаў устаноў раёну па форме адваротнага боку талёну.

4. У талёнах разьліковых ведамасьцяй усімі страхавальнікамі акрамя дзяржбюджэтных абавязкова павінна паказвацца належачая заработная плата (а не выплачваемая).

5. Органам Дзяржпляну і Гапоўстраху прасачыць за выкананьнем гэтае пастановы.

Нарком РСІ БССР КАЛНІН.

17-га красавіка а 7-й гадзіне ўвечары ў залі пасяджэньняў ЦСПСБ адбудзецца

нарада старшынь камісій па аглядзе грамадзкага харчаваньня

разам з старшынямі фабзаўкомаў,

на якой будуць заслуханы справаздачы аглядавых камісій і фабзаўкомаў аб ходзе агляду наступных прадпрыемстваў: 1) заводу «Чырвоная Зара», 2) 1-й дзярждрукарні, 3) заводу «Камунар», 4) шчацінная фабрыкі і 5) МК № 1 чыгуначнікаў.

На нараду павінны зьявіцца **старшыні аглядавых камісій і фабзаўкомаў наступных прадпрыемстваў:** «Чырвоная Зара», хлебазаводу, дражджавога заводу, баснай фабрыкі Белмясгандлю, быдла-бойні, 1-й дзярждрукарні, шпалернай фабрыкі, друкарні БАН, працкалектыву друкароў, друкарні «Зьвязда», заводаў «Камунар», «Энэргія», «Эльводу», палаты мер і вагі, заводу «Бальшавік», абутковай фабрыкі, шчацінной фабрыкі, працкалектыву абутнікаў, шавецкай майстэрні Гандальбуду, Упівэрсытэцкага гарадка, кахлянага заводу, Водаканалбуду, «Белдартрансу», зав. «Дрэваапрацоўшчык», швейнай фабрыкі «Касьтрычнік», футравай фабрыкі, МК №№ 1, 2 і 3, пасажырск. станц. і № 2 таварнай, пажарнае каманды, гуты «Пралетары», «Чырвоны Хэмік», фармазаводу, «Чырвоны Тэкстыльшчык», 1 і 2 рабачкомы грузчыкаў, працкалектыву лямпавікоў і вяровачнікаў.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ КАМІСІЯ ПА АГЛЯДЗЕ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ. ЦСПСБ.

Нарада жонак кампалітскладу Менскага гарнізону.

Аўторак, 15 красавіка

МЕНСКІ АКРУГОВЫ КАМІТЭТ МОПР'у

скліча

Ў ПАМЯШК. АК МОПР'у (Савецкая, 87, 2-й паверх)

НАРАДУ ЖОНАК КАМПАЛІТСКЛАДУ Менскага гарнізону

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Аб рабоце МОПР'у сярод жонак кампалітскладу і падрыхтоўка да 1-га Мая.

Просьба да ўсіх жонак кампалітскладу зьявіцца без опазьненьня.

Запрашаецца кампалітклад.

Пачатак роўна а 7 гадз. увеч.

Мен. АК МОПР.

Калектыў працаўнікоў групкому мэдсанпрацы № 23, бюро ячэйкі КП(б)Б Беларускага Дзяржаўнага Сухотнага Інстытуту выказваюць сваё глыбокае спачуваньне супрацоўніцы сухотнага інстытуту

т. **Рыбаковай Таццяне Савельлевай** з прычыны **сьмерці мужа**

Меленція Фёдаравіча РЫБАКОВА.

КАЛЕКТЫЎ ПРАЦАЎНІКОЎ БЮРО ЯЧЭЙКІ.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР
Сэзон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску
Б. Лаўрэнеў.
Аўторак, 15 красавіка для саюзу хаўрайкоў
РАЗЛОМ
п'еса ў 4-х дзеях.
Рашта білетаў у кассу тэатру і ў рабочай касе. **Пачатак а 8 гадз.**

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА
Мастацкі фільм вытворчасьці Савкіно
ПАКІНУТЫ ВОСТРАЎ
у 6 част.
Звыш праграмы кіно-хроніка Савкіно № 16.
Пач. дзен. сэанс: 1 гадз., 3 г. 20 м.
Каса з 12 г. дня.
Веч. вячэрн. сэанс. а 7 г. Каса ад 5 г. увеч.
На дзенныя сэансы цэны ад 15 к. да 35 к.

КІНО ВЯЗРАЦЬЯВА
2-гі тыдзень постаноўкі 2-гі
нямецкі фільм
МАРЦІН ФАЛЬКХАГЕН
У галоўнай ролі **Жэні Портэн.**
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ кіно хроніка САВКІНО
Дзенныя сэансы: 1 г. 30 м., 3 гадз.
На дзенныя сэансы ўсе білеты па 25 кап.
Каса ад 12 гадз. дня.
Вячэрнія сэансы: 7 г., 8 г. 30 м., 10 г. 20 м.
Каса ад 5 гадз.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ
2 фільмы ў адзін сэанс 2
1. Палітасьветны фільм
ЗА ВАША ЗДАРОЎЕ ў 5 част.
У галоўных ролях: **Чысьцякоў і Блюмэнталь-Тамарына.**
2. Замежная камэдыя **Цёмны канёк** у 2 частках.
Пач. 1-га сэансу а 7 г. Каса з 5 гадз.

1-шы ліцэйны кіно-тэатр ЮЛЬЯ ШІННЭР
МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
паводле тэмы спавяданьня **Анры Барбюса**
„Здань, якая не варочаецца"
мэлядрама ў 7 частках.
Пач. 1-га сэансу а 2 гадз., 2-га—3 г. 30 м.
Каса адчыняна ад 12 гадз.

КІНО СПАРТАК
Нямецкі баявік
2-е ЖЫЦЬЦЁ
драма ў 7 частках.
Пачатак 1-га сэансу а 7 г., 2-га—а 9 г., 3-га—а 10 г. 45 м.
Касы—ад 5 г. 30 м.

КЛЮБ ІМЯ КАРЛА МАРКСА
Сёньня, 15-га красавіка
ТОЛЬКІ АДЗІН КАНЦЭРТ
СОЛЬНЫХ ВЫСТУПЛЕНЬНЯЎ
пэдагогаў музтэхнікуму на ўсіх муз. інструментах.
ПАДРАБЯЗНАСЬЦІ Ў АФІШАХ.
Білеты ад **30** к. да **95** к. продаюцца ў рабочай касе, а ў дзень канцэрту і ў касе клюбу Карла Маркса з 6 гадз. увеч.
Па калектыўных заяўках КРЭДЫТ.

ЦЭНТРАЛЬНАЕ ВЫДАВЕЦТВА НАРОДАЎ СССР
МЕНСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ
ПАДПІСКА на САМАВУЧЫЦЕЛІ
НЯМЕЦКАЕ і АНГЕЛЬСКАЕ МОВАЎ
ПРЫМАЕЦЦА ў НАСТУПНЫМ ПАРАДКУ:
пры падпісцы . . . . . 1 руб. 50 кап.
« атрыманьні 3-га выпуску 1 руб. 25 кап.
« « 6-га выпуску 1 руб. 25 кап.
« « 9-га выпуску 1 руб.
Усяго 5 руб. за 20 выпускаў.
КУРС РАЗЬЛІЧАНЫ на ДВА ГАДЫ.
Падпіска прымаецца на кніжнай базе (Камсамольская, № 5).

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты да 2 гадзіны дня

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА
15 КРАСАВІКА РОЎНА А 6 ГАДЗ. УВЕЧ. СКЛІКАЕЦЦА
АГУЛЬНЫ СХОД БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ,
МАСТАКОЎ, АРТЫСТЫХ.
НА АББЕСТЫЦЫ ДНЯ:
аб тыдні беларускай літаратуры і мастацтва у Маскве
(інфармацыя прадстаўніка камісіі т. ШУКАЙЛА).
Просьба да ўсіх пісьменьнікаў, мастакоў, артыстых прынесьці з сабой па 2 фота-карткі (годныя для кліша), а таксама пажаданы кароткія аўтабіяграфіі.

К-т Віцебскай Акруговай Страхавой Касы
абвяшчае КОНКУРС
на ўрача-загадчыка
дома адпачынку «Чырвоны Кастрычнік» пры ст. Завольша МБВ чыгункі.
Умовы: аклад утрыманьня 175 р., кватэра, апал і асьвятленьне.
Тэрмін падачы заяў да 20 красавіка г. г.

ТРЕБУЮТСЯ
КАРТОНАЖНЫЕ проволоко-швейные **МАШИНЫ,**
желательно с механическим приводом.
Предложение по адресу: Ленинград, Б. Зеленина, д. № 18-а, Картонажная ф-на № 2.

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумэнта

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА КАМІТЭТУ ГАРАДЗКОГА — УЗАЕМАДАПАМОГІ
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў, тэл. 12
АДКРЫТА ад 9 гадз. рэн. да 9 г. увеч
Прыём хворых по ўсіх спэцыяльнасьцях:
па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.
Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г. 30 м. да 9 г. увеч.
Прыём хэміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. увеч. штодзённа
Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на даму па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.
Дзяжурства дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Начное дзяжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз. раніцы.
Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту
Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную дыфэрэнцыяваную плату.

30 тысяч цэнтн. рыбы павінен даць улоў у гэтым годзе

„БЕЛРЫБА" і БЕЛСАМПРАМСАЮЗ БАДАЙ НІЧОГА НЕ ЗРАБІЛІ, КАБ ВЫКАНАЦЬ ГЭТЫ ПЛЯН

Наяўнасьць у БССР 82.000 гэкт. вазёр і 32.000 кілёмэтраў рэк дае магчымасьць пры ўважлівых адносінах з боку мясцовых арганізацый выканаць у гэтым годзе плян улову ў 30.000 цэнт.

Да гэтага часу на разьвіцьцё рыбнае справы ў Беларусі не зважалася ўвагі. Рыбаводны аддзел Наркамзему БССР палітычай здачы вадаёмаў у арэнду прыватніку дапамагаў драпежніцкаму вылаву рыбы; значная частка рыбы — каля 80-90 проц. ішла не праз рабочую кааперацыю, а праз прыватніка.

Пастановаю Эканомнарады аб стварэньні спэцыяльнага акцыянэрнага таварыства «Белрыба» пакладзен пачатак разьвіцьцю рыбнай прамысловасьці. На «Белрыбу» з асноўным усклядаецца задача культываваньня шматлікіх рачных і вазёрных вадаёмаў у Беларусі, правядзеньне мэліярацыі, засяленьне вадаёмаў цэннымі пародамі рыб, кантроль за правільным уловам і г. д.

Актуальнейшым пытаньнем сёньняшняга дня зьяўляецца **выкананьне пляну ўлову рыбы па натуральных вадаёмах.** Пастановаю Эканомнарады ад 11 студзеня на сампрамкааперацыю ўскладзена кіраўніцтва існуючымі рыбацкімі арцелямі, аднячасова арганізацыя новых арцеляй. Гэта пастанова прадугледжвала сканцэнтраваньне арганізацыйнага кіраўніцтва і забясьпячэньня прыладамі лову ў адзіным каапэрацыйным цэнтры.

Здавалася-б, што па такое важнае пытаньне, ад якога ў значнай ступені залежыць забясьпячэньне мясцовымі прадуктамі рабочых цэнтраў БССР, сампрамкааперацыя павінна была зьвярнуць асаблівую ўв